Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ВЕРАСНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 169 (28027) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Якасць адукацыі з новым падтэкстам

СТАР. 7



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Меліціна Станюта: «Рабіць добра нескладана»

СТАР. 22

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН:**

*«За 15 апошніх гадоў айчынная навука здзейсніла сапраўдны прарыў. Нельга сказаць, што яна вырашыла ўсе свае праблемы. Ёсць цяжкасці, якія трэба пераадолець, але тое, што дасягнута за апошнія 10-15 гадоў, — гэта прарыў. Перад Нацыянальнай акадэміяй навук пастаўлены задачы інтэгравацца ў эканоміку, працаваць на эканоміку, забяспечваць інавацыйнае развіццё краіны, навукова-тэхнічны прагрэс. І гэтыя задачы паспяхова вырашаюцца. Беларуская навука заўсёды была высокаразвітой. Але адразу пасля распаду Савецкага Саюза мы аказаліся без сродкаў да існавання, адмяніліся буйныя ваенныя і прамысловыя заказы. Давялося перабудоўвацца і шукаць новых заказчыкаў, і цяпер НАН Беларусі дасягнула стадыі ўстойлівага развіцця».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17573,00 | ▼ |
| Еўра | 19735,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 262,28 | ▼ |
| Укр. грыўня | 796,78 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МАЛІНАВЫ ВЕРАСЕНЬ

**Хто сказаў, што ўраджай кусты малін даюць улетку — у чэрвені ды ліпені? На прадпрыемстве «Арніка-Агра», што знаходзіцца ў Магілёўскім раёне, з гэтым гатовы паспрачацца. Тут у першыя восеньскія дні збіраюць больш за тону чырвоных сакавітых ягад штодня. Збор салодкага ўраджаю ў гаспадарцы пачаўся ў сярэдзіне жніўня і працягнецца да канца верасня. Працы на малінавай плантацыі брыгадзіру-садаводу Жанне АНДРЭЕВАЙ і яе калегам яшчэ хопіць, але ж ім можна толькі пазайздросціць: восенню ўдыхаць водар самага сапраўднага лета — гэта ж так хораша.**



Фота БЕЛТА.

■ Размова па сутнасці

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ЧЫТАЦЬ ДОБРЫЯ КНІГІ

**І адзначаць Дзень беларускага пісьменства, дзе кнігі і іх стваральнікі — галоўныя героі**



Фота БЕЛТА.

**У гэтыя выхадныя Шчучын будзе сустракаць Дзень беларускага пісьменства. Свята, якое ўжо стала добрай традыцыяй у культурным жыцці краіны, аналагаў якому на дзяржаўным узроўні няма, напэўна, ва ўсім свеце. Яшчэ адна традыцыя гэтага дня — нягледзячы на тое, што адзначаем мы яго, лічы, два дзясяткі гадоў, абавязкова будзе нешта новае і цікавае. Напрыклад, сёлета краіна даведаецца імёны лаўрэатаў першай Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Штогод Дзень беларускага пісьменства, дзе б ён ні праводзіўся, збірае тысячы ўдзельнікаў і гасцей. Аб тым, што спрыяе такому інтарэсу да мерапрыемства, аб яго сутнасці і адметнасці — гутарка карэспандэнта «Звязды» з міністрам інфармацыі Ліліяй АНАНІЧ.**

СТАР. 3

■ Надвор'е

## ХАЛАДНАВАТА І ДАЖДЖЫ, МЕСЦАМІ — МОЦНЫЯ

**На выхадных чакаецца толькі 21-23 цяпла**

**Гэтымі днямі на тэрыторыі Беларусі захаваецца халаднаватае з ападкамі надвор'е, а ў нядзелю прагназуюцца нават моцныя дажджы. Пра гэта паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Сіноптыкі адзначаюць, што першыя дні восені былі яшчэ даволі цёплымі, але ў сярэдзіне тыдня франтальны раздзел рэзка змяніў характар надвор'я. Прайшлі кароткачасовыя навальнічныя дажджы, месцамі пры навальніцах узмацняўся вецер парывамі да 15-17 м/с, у асобных раёнах выпаў град. Істотна панізіўся і тэмпературны фон.

У пятніцу да нас завітае франтальны раздзел, які зміяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы. Таму ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у паўднёвых раёнах — месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература ўдзень складзе плюс 16-22 градусы, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах будзе крыху цяплей — 23-26 градусаў. У суботу наша краіна трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах 8-15 цяпла, а ўдзень — плюс 17-23 градусы. Прагназуецца, што ў нядзелю тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам атмасфернага франтоў. У большасці раёнаў чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а па ўсходзе краіны месцамі — даволі моцныя. У некаторых раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-15 градусаў, удзень — толькі 15-21 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першай палове наступнага тыдня ўмовы надвор'я ў краіне будуць вызначацца ўплывам скандынаўскага цыклону і няўстойлівых халаднаватых паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора.

СТАР. 5

# АГУЛЬНАЯ ПАМЯЦЬ І АДКАЗНАСЦЬ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысутнічаў на ваенным парадзе ў Пекіне, што праводзіўся з нагоды 70-годдзя Перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны, паведамляе БЕЛТА. Гэта было ўнікальнае мерапрыемства — упершыню з моманту ўтварэння КНР у краіне быў арганізаваны буйнамаштабны ваенны парад, не прысвечаны нацыянальнаму святу — Дню ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі.**

На парадзе прысутнічалі каля трох дзясяткаў лідараў замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый. У прыватнасці, сярод запрошаных гасцей былі кіраўнікі Расіі, Чэхіі, Сербіі, Венесуэлы, КНДР, краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Азіі.

Лідары дзяржаў на працягу паўгадзіны прыбывалі на плошчу Цяньаньмэнь. За варотамі павільёна «Дуаньмэнь» іх вітаў Старшыня КНР Сі Цзіньпін. Пасля калектыўнага фатаграфавання кіраўнікі дзяржаў, у ліку якіх быў і Аляксандр Лукашэнка, прайшлі на трыбуну, адкуль назіралі за маляўнічым дзействам, што разгортвалася на плошчы.

У святочны для Кітая дзень адна з найбуйнейшых газет краіны «Жэньмінь жыбаа» апублікавала інтэрв'ю з беларускім лідарам, якое карэспандэнты выдання ўзялі ў Аляксандра Лукашэнкі перад яго афіцыйным візітам у КНР.

Любыя спробы змяніць гісторыю асуджаны на правал, гэта падкрэсліў у інтэрв'ю Прэзідэнт Беларусі. «Другая сусветная вайна — адна з цэнтральных падзей XX стагоддзя, якая вызначыла ход гісторыі ва ўсім свеце на многія дзесяцігоддзі наперад, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Калі асноўную ношу ў вайне супраць Германіі вынес савецкі народ, то асноўны цяжар вайны з Японіяй, вядома ж, лёг на плечы кітайскага народа. Я ні ў якім разе не хачу прыніжаць ролю нашых саюзнікаў: безумоўна, яны таксама ўнеслі значны ўклад у нашу агульную перамогу — і ў Еўропе, і ў Азіі. Але з лічбамі ўсё ж не паспрачаешся: згодна з апошнімі даследаваннямі, савецкія страты за гады вайны склалі каля 27 млн чалавек, кітайскія — 35 млн чалавек. Ніякія іншыя краіны не мелі такіх вялікіх ахвяр. Беларусь, якая была часткай СССР, пацярпела, бадай, больш за іншых — мы страцілі амаль трэць свайго насельніцтва».

«Неабходна сумленна прызнаць, што ў свеце існуюць сілы, зацікаўленыя ў пераглядзе вынікаў Другой сусветнай вайны. Для чаго яны гэта робяць? Каб, паставіўшы пад сумненне гістарычную праўду, аспрэчыць сённяшнія правы і інтарэсы краін, што вынеслі асноўны цяжар вайны ў Еўропе і Азіі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, гэтага нельга дапускаць.

«Як гаворыцца ў адным вядомым выслоўі, тыя, хто не засвоілі гісторыю, абавязкова яе паўтораць. І ў гэтым кантэксце на Кітай ускладзена асаблівая, калі хочаце, гістарычная місія: калі паўтарамільярдны кітайскі народ будзе помніць і шанаваць вынікі і праўду аб Другой сусветнай вайне, нікому не ўдасца яе сказіць, аддаць забыццю», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы асабліва закрануў тэму пасляваеннага сусветнага парадку на чале з ААН. На яго думку, ідэі 70-гадовай даўніны аб цэнтральнай ролі гэтай арганізацыі ў свеце зноў запатрабаваны. Безумоўна, ААН павінна ісці ў нагу з часам і праводзіць неабходныя рэформы. Аляксандр Лукашэнка абсалютна ўпэўнены ў тым, што мэты і прынцыпы Статута ААН, а таксама кампетэнцыі яе асноўных органаў, прадпісаныя гэтым дакументам, павінны заставацца непарушнымі.

Прэзідэнт Беларусі пажадаў народу КНР мірнага неба над галавой і здзяйснення кітайскай мары аб пабудове яшчэ больш моцнай і квітнеючай дзяржавы на аснове якаснага росту эканомікі, асабістага поспеху і дабрабыту яе грамадзян.

«У асобе беларусаў кітайскі народ мае самых надзейных і адданых сяброў і партнёраў у цэнтры Еўропы», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. «Беларусь вельмі цэніць і ганарыцца аднослівымі ўсебаковага стратэгічнага партнёрства з Вялікім Кітаем», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

# ПАДПІСАНЫ ДЭКРЭТ АБ ЗАМЕЖНАЙ БЯЗВЫПЛАТНАЙ ДАПАМОЗЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Дэкрэт №5 «Аб замежнай бязвыплатнай дапамозе». Каментарый да яго размешчаны на партале Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, паведамляе БЕЛТА.**

Дакументам зацверджана Палажэнне аб парадку атрымання, уліку, рэгістрацыі, выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі, кантролю за яе атрыманнем і мэтавым выкарыстаннем, а таксама рэгістрацыі гуманітарных праграм.

Палажэнне ўстанаўлівае пералік мэт, на якія можа быць выкарыстана замежная бязвыплатная дапамога і маёмасць, набытая за кошт сродкаў такой дапамогі: ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, правядзенне навуковых даследаванняў, садзейнічанне ахове гісторыка-культурнай спадчыны, аказанне медыцынскай дапамогі, аказанне сацыяльнай дапамогі грамадзянам і інш.

Таксама вызначана, на якія мэты бязвыплатная дапамога не можа быць накіравана (ажыццяўленне экстрэмісцкай дзейнасці, іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам, фінансаванне палітычных партый, падрыхтоўку і правядзенне выбараў і рэферэндумаў і інш.) і якія тавары не могуць прадастаўляцца ў якасці дапамогі (напрыклад, забароненыя да ўвозу тавары).

У палажэнні падрабязна ўрэгуляваны пытанні, звязаныя непасрэдна з парадкам атрымання бязвыплатнай дапамогі і яе выкарыстаннем.

Устаноўлена, што дзеянне норм палажэння не распаўсюджваецца на міжнародную тэхнічную дапамогу; замежную бязвыплатную дапамогу, што прадастаўляецца па праектах і праграмах, адобраных Прэзідэнтам, а таксама ў адпаведнасці з дзеючымі для Беларусі міждзяржаўнымі дагаворамі; замежную бязвыплатную дапамогу, што атрымліваецца дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Беларусі, банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі, Нацыянальным банкам, ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, у дэкрэце ўстаноўлены парадак расходавання замежнай бязвыплатнай дапамогі, што атрымліваецца дыппрадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі краіны.

Права растлумачваць пытанні прымянення дэкрэта прадастаўлена Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта.

Дакумент зарэгістраваны ў Нацыянальным рээстры прававых актаў 2 верасня 2015 года, яго асноўныя палажэнні ўступаюць у сілу праз шэсць месяцаў пасля афіцыйнага апублікавання.

■ Блізкая ўлада

# ГАРАЧЫ ЖНІВЕНЬ БЕЗ ХАЛОДНАЙ ВАДЫ

**Сёлетні жнівень выдаўся як ніколі гарачым і засушлівым. У некаторых населеных пунктах былі перабоі з водазабеспячэннем. У прыватнасці, такую праблему агучылі жыхары вёскі Налібокі Стаўбцоўскага раёна падчас прамой тэлефоннай лініі, што правёў кіраўнік спраў Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ. «Вада ў нас бывае толькі падчас дажджоў», — скардзіліся жыхары. А сёлета іх практычна і не было. Ды, як аказалася, справа не толькі ў адсутнасці дажджоў. Прычына ў тым, што камунікацыі былі спраектаваны і пракладзены, мякка кажучы, з агрэхамі.**

Уважліва выслухаўшы заяўнікаў, Іван Маркевіч звязаўся са старшынёй Стаўбцоўскага райвыканкама. Магчыма, гэты званок паскорыць вырашэнне пытання. Але ўсё ж трэба быць аб'ектыўнымі: каб наладзіць нармальную работу водапровада, патрэбны час і пэўныя фінансавыя ўкладанні.

Дарэчы, у сувязі з анамальным надвор'ем праблема забеспячэння вадой хвалявала не толькі жыхароў Налібокаў. На адну з «прамых ліній» з аналагічным пытаннем ужо звярталіся жыхары аграгарадка Возера Уздзенскага раёна. Воданапорная вежа з надыходам гарачыні не вытрымлівала нагрузак: побач жывёлагадоўчая ферма, якая пастаянна патрабуе немалых аб'ёмаў вады, ды дачных кааператываў, ды і на цэнтральнай сядзібе гаспадаркі апошнім часам пабудавана новае жыллё з водаправодам. Аб гэтай праблеме ведае не толькі кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства, але і райвыканкама. Яна з цягам часу будзе вырашаца.

Жыхарка аднаго з населеных пунктаў Пухавіцкага раёна расказала, што больш як 25 гадоў таму з мужам атрымалі забалочаны ўчастак зямлі для будаўніцтва. Але, перш чым узвесці жыллё, спатрэбілася шмат намаганняў, каб адвесці ваду з яго, а таксама — прылеглых надзелаў. А сёлета добраўпарадкаваны ўчастак нехта «прыбраў» да сваіх рук. Іван Маркевіч патэлефанаваў старшыні Пухавіцкага райвыканкама з просьбай разабрацца ў сітуацыі разам з мясцовымі землеўпарадкавальнымі службамі і сельсаветам.

Жыхароў вёскі Пятровінка Чэрвеньскага раёна хвалявала пытанне адкрыцця грамадскай лазні. На цэнтральнай сядзібе сельгаспрадпрыемства яшчэ ў маі яе закрылі на рамонт. Абяцалі нібыта толькі на месяц. Але да гэтага часу яна не працуе. Лазняй карыстаецца шмат людзей — толькі ў цэнтры гаспадаркі пражывае больш як 150 чалавек. Кіраўнік сельгасарганізацыі спасылаецца на недахоп грошай, каб завяршыць рамонт. Іван Маркевіч звязаўся са старшынёй раённага Савета дэпутатаў і папрасіў яго разам з кіраўніцтвам гаспадаркі прааналізаваць розныя варыянты дапамогі жыхарам і да вечара даць адказ.

Можна зразумець і крыўду жыхара Мінска. Мужчына купіў сабе ўчастак пад дачную забудову ў Маладзечанскім раёне яшчэ ў 2008 годзе. Але да гэтага часу не можа яго прыватызаваць — не па сваёй віне. Проста раённыя чыноўнікі перабльталі нумары ўчасткаў. Заяўнік не першы раз збірае пакет дакументаў для правільнага афармлення, прычым робіць гэта за свае грошы, а пытанне так і не вырашаецца. Іван Маркевіч па гарачых слядах патэлефанаваў старшыні раённага Савета дэпутатаў з папрабаваннем разам з іншымі адказнымі асобамі неадкладна прыняць чалавека. З'явілася надзея, што праблема будзе нарэшце вырашана.

Бясспрэчна, паступалі на «прамую лінію» і званкі, якія не патрабавалі ўмяшання абласных службаў і структур. Напрыклад, шматдзетная маці з Нясвіжа цікавілася, ці мае права сям'я на льготы пры аплаце купленага ў прыватнай асобы дома. Пенсіянерка з пасёлка Сонечны Мінскага раёна папрасіла дапамагчы наладзіць транспартнае абслугоўванне. А з Беразіно паскардзілася жанчына, што мужу не выплацілі своечасова зарплату. Нехта прасіў дапамогі ўладкаваць з'езд з дарогі да дома, іншы — пасадзейнічаць у рамонце 800 метраў грунтовай дарогі, якая нагадвае хутчэй траншэю дошку. Усяго ж Іван Маркевіч разгледзеў больш як 20 зваротаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Сезон

## ПАЛЯВАННЕ БУДЗЕ? ТОЛЬКІ НЕ НА ТАРФЯНІКАХ

**З 5 верасня ў краіне павінен распачацца сезон палявання на птушыную дзічыну. Нагадаем, што яго пачатак сёлета пераносіўся двойчы з прычыны анамальных умоў надвор'я.**

— Гаворка ідзе пра вадаплаўную дзічыну (акрамя гусі) і балотную, вальдшнэпа, вяхіра, шызага голуба, перапёлку, фазана (любога полу і ўзросту), — распавёў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей. — Паляваць дазваляецца ў светлы час сутак зброевым спосабам, з засады, з падыходу, з пад'езду на маламерных суднах (без рухавіка або з непрацуючым рухавіком), з выкарыстаннем гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, з паляўнічымі сабакамі (усе групы, акрамя ганчакоў і хартоў). Таксама можна здабываць дзічыну бязьзброевым спосабам з выкарыстаннем лоўчых птушак.

Праўда, Міністэрства лясной гаспадаркі настойліва рэкамендуе ўсім карыстальнікам паляўнічых угоддзяў абмежаваць правядзенне палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну толькі вадаёмамі і вадацёкамі, выключыўшы яго на тарфяніках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Рэха вайны

# ПАЙШОЎ, КАБ ВЯРНУЦЦА...

**Астанкі 21 чырвонаармейца знайшлі ўдзельнікі 52-га асобнага спецыяльнага пошукавага батальёна Міністэрства абароны ў лесе каля вёскі Рыбакоўшчына на Уздзеншчыне падчас раскопак. У тым ліку — дзве капсулы з медальёнамі загінулых.**

Адна з іх пустая, у другой выявілі папяровы ўкладыш шэрага колеру з рукапісным тэкстам. Як паказала экспертыза, ён належаў Кастусю Нямчонку, які нарадзіўся ў 1907 годзе ў вёсцы Дзешчанка Уздзенскага раёна. На вайну быў прызваны 22 чэрвеня 1941-га.

Семдзесят гадоў баец лічыўся прапаўшым без вестак. Да апошняга яго бацькі, жонка, дзеці не пакідалі надзеі давведацца пра лёс сына, мужа, бацькі. Дачакалася весткі толькі яго ўнучка Соф'я Цэдрык, якая жыве ў аграгарадку Крупіца Мінскага раёна.

Пра свайго дзеда Кастуся Соф'я Іванаўна ведае са слоў бабулі. Калі пачалася вайна, ён заскочыў на хвілінку дадому развітацца. І ніхто нават не здагадваўся, што Канстанцін Сцяпанавіч загінуў побач з роднай вёскай, якая знаходзіцца літаральна ў 10 кіламетрах ад месца былога бою. Пасля таго, як сціхла страляніна, мясцовыя жанчыны спрабавалі туды прабрацца, каб знайсці і пахаваць чырвонаармейцаў, але немцы іх не пусцілі. Вядома, улічваючы тое, што адбывалася ў тыя страшныя дні лета 1941 года, можна ўявіць, як загінулі Канстанцін Сцяпанавіч і яго сябры па зброі: астанкі наспех прысыпаны зямлёй, раскіданы па ўсім лесе.

— Спачатку ўнучка хацела пахаваць астанкі дзеда ў магіле бабулі і маці. Але ёй параілі выбраць брацкую магілу ў вёсцы Анопаль, паколькі урна змяшчае прах яшчэ аднаго чырвонаармейца, імя якога невядома. Перазахаванне павінна адбыцца ў верасні, — адзначыла **спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Уздзенскага райвыканкама Іна ПЯТКЕВІЧ.**

52-гі пошукавы батальён з'яўляецца партнёрам Народнага саюза Германіі па правядзенні пошукавых работ і эксгумацыі астанкаў. Яго ўдзельнікі неаднаразова знаходзілі астанкі загінулых падчас Вялікай Айчыннай вайны воінаў, якія перадаваліся расійскаму, украінскаму і беларускаму боку, незалежна ад таго, на тэрыторыі якой краіны яны ахвяравалі сваім жыццём.

На тэрыторыі Уздзенскага раёна гэта ўжо не першае знойдзенае воінскае пахаванне. Астанкі загінулых абаронцаў хаваюць на могілках у вёсцы Цеплень з ушанаваннямі, ганаровай вартай, запрашэннем ветэранаў, прадстаўнікоў грамадскасці і мясцовай улады.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ДА ГРЫПУ РЫХТУЮЦЦА ЗАГАДЗЯ

**Ахоп вакцынацыяй 40% работнікаў прадпрыемства — аптымальны з пункту гледжання панесеных выдаткаў атрыманай карысці і дазваляе эфектыўна ўплываць на ўзровень захваральнасці на вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі і грып. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты сталічнай санэпідслужбы.**

Вынікі маніторынгу захваральнасці сведчаць, што, калі прышчэпліваецца ад грыпу да 40% членаў калектыву, гэта дазваляе знізіць узровень захваральнасці на ВРІ і грып у эпідсезон сярод прышчэпленых у 1,7-3,9 раза ў параўнанні з непрышчэпленымі.

На фоне павелічэння ахопу вакцынацыяй супраць грыпу зніжаецца таксама і ўзровень захваральнасці сярод непрышчэпленых. Такі эфект з'яўляецца вынікам дзеяння калектыўнага імунітэту. Кіраўнікі каля 1750 прадпрыемстваў і арганізацый сталіцы ўжо пацвердзілі гатоўнасць фінансаваць вакцынацыю супраць грыпу сваіх супрацоўнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ЧЫТАЦЬ ДОБРЫЯ КНІГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**— Лілія Станіславаўна, на Міжнародную кніжную выставу, што праходзіла ў лютым у Мінску, сёлета завітала рэкордная колькасць гасцей — прыехалі пісьменнікі і выдаўцы амаль з 30 краін свету. Свята беларускага пісьменства таксама зможа пахваліцца колькасцю гасцей, ці ўсё ж для такога мерапрыемства гэта не самамэта, а галоўнае — прадаставіць пляцоўку менавіта беларускім творцам і выдаўцам?**

— Несумненна, Дзень беларускага пісьменства — найперш свята для тых, хто працуе з мастацкім і публіцыстычным словам (пісьменнікаў, журналістаў, выдаўцоў) і іх чытачоў. Гэта акурат той выпадак, тая магчымасць, калі аўтар і тыя, для каго ён піша, могуць паглядзець, як кажуць, адно аднаму ў вочы, пазнаёміцца асабіста, абмяняцца думкамі. Менавіта з гэтай мэтай і задумвалася дваццаць гадоў таму свята, і невыпадкова яно ўжо каторы год адзначаецца на дзяржаўным узроўні ў розных гарадах нашай краіны. Пісьменства — адзін са складнікаў духоўнасці нашага народа, яно, як і асвета, мае на беларускай зямлі тысячагадовыя карані. Мяняецца спосаб перадачы думак творцы, але не мяняецца сама сутнасць творчасці: яна выхоўвае чалавека, дапамагае яму станавіцца лепшым, адукоўвае яго. Мы па-ранейшаму нацыя, якая чытае, і ў нас ёсць свята, на якім пра гэта можна сказаць і засведчыць на ўвесь голас. Не ведаю, ці можа сёння яшчэ якая краіна пахваліцца падобным дзействам.

Менавіта таму, што можам паказаць нешта сваё, нацыянальнае, адметнае, мы і запрашаем на гэтае свята замежных гасцей. Як правіла, гэта прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаваныя ў нашай краіне. Але з кожным годам форумам на пачатку верасня цікавяцца і калегі з іншых краін — пісьменнікі, журналісты, выдаўцы. Прычым прыязджаюць яны ўсё часцей не як гледачы і госці — як самыя непасрэдныя ўдзельнікі дзейства, падчас якога праходзяць дыскусіі, прэзентацыі, наладжваюцца кантакты на перспектыўнае супрацоўніцтва.

**— Стасункі паміж пісьменнікамі, журналістамі, выдаўцамі на міжнародным узроўні, несумненна, вельмі важныя. Беларускую кнігу добра ведаюць на ўсім свеце. Але якія практычныя дывідэнды (у наш меркантыльны час пра гэта нельга не спытаць) мае айчынная кнігавыдавецкая сістэма, акрамя наладжаных гуманітарных сувязяў ды высокіх адзнак на ўсемагчымых конкурсах?**

— У наш меркантыльны, як вы сказалі, час, сапраўды, эфектыўнасць мераецца практычнымі вынікамі. Але якімі грашыма, у якой валюце ацаніць прэстыж дзяржавы, яе імідж? А беларускія кнігі на міжнароднай арэне працуюць менавіта на яго. Напрыклад, наша краіна атрымала Гран-пры міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД. А ўсяго мы прывезлі 12 дыпломаў гэтага конкурсу. І гэта толькі адзін, самы «свежы» прыклад. Нашу кнігу ведаюць і годна ацэньваюць ва ўсім свеце. А кніга і сёння — паказчык адукаванасці і інтэлекту, гэта наша найлепшая візітоўка. З разумнымі, пісьменнымі людзьмі ахвотней бяруцца за любую справу. Вось і адказ на ваша пытанне аб «дывідэндах». Я не кажу ўжо аб выгадных кантрактах, якія прапаноўваюцца нашым выдаўцам, бо паліграфія нашых выданняў адпавядае самым высокім патрабаванням якасці.

**— Як правіла, Дзень беларускага пісьменства — гэта выдатная пляцоўка не толькі для творцаў, выдаўцоў і чытачоў, на якой можна пазнаёміцца і паспрачацца, але і для дыскусій прафесіяналаў аб ролі літаратуры ў сучасным грамадстве. На сёлетнім X Беларускім міжнародным медыяфоруме з тэмай «Партнёрства ў імя будучыні: спадчына Вялікай Перамогі» шмат гаварылі пра адказнасць за напісанае і сказанае, пра ўплыў новых інфармацыйных тэхналогій на свядомасць людзей. Тэма міжнароднага круглага стала, які становіцца ўжо традыцыйным мерапрыемствам Дзён пісьменства, — «Літаратурны працэс і інфармацыйнае грамадства». Зноў размова пойдзе пра адказнасць — цяпер ужо пісьменнікаў?**

— Гэта размова пачалася яшчэ ў лютым, калі падчас Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу праходзіў круглы стол «Пісьменнік і час». Сімвалічна, што падобныя дыскусіі творцаў, якія маюць актыўную грамадскую пазіцыю, праходзяць адначасова з вельмі важнымі для Беларусі падзеямі. На круглым стале «Пісьменнік і час» гаварылі аб стваральнай сіле мастацкага слова, аб яго ролі ў выбары шляху, па якім пойдзе грамадства, менавіта тады, калі ў Мінску лідары нармандскай чацвёркі праводзілі лёсавызначальныя перамовы па ўкраінскім канфлікце. Медыяфорум, на якім шмат гаварылі пра захаванне гістарычнай праўды, пра недапушчэнне фальсіфікацый падзей Вялікай Айчыннай вайны, праходзіў якраз пад знакам святкавання 70-годдзя Перамогі. Гэтым разам краіна жыве найважнейшай падзеяй, ад якой залежыць яе далейшае развіццё — перадвыбарнай прэзідэнцкай кампаніяй. І я спадзяюся, што падчас круглага стала ў межах Дня пісьменства, які Міністэрству інфармацыі дапамагаюць правесці Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда», пісьменнікі з розных краін будуць гаварыць не толькі пра тое, як сёння павінен развівацца літаратурны працэс, але і пра тое, які ўплыў ён мае на грамадства. І аб самім грамадстве, аб яго самаўсведамленні, аб крытэрыях, па якіх мераецца яго сталасць, яго здольнасць зрабіць свой асэнсаваны выбар, што дазволіць краіне і яе жыхарам жыць і спакойна працаваць на сваёй зямлі. Пісьменнікі былі і застаюцца людзьмі аўтарытэтнымі, таму іх меркаванне на гэты конт вельмі важнае, асабліва цяпер.

**— Шмат увагі зараз выдаўцы надаюць мастацкаму афармленню кніг, і мы тут у лідарах, пра гэта сведчаць перамогі беларускіх выданняў у шматлікіх конкурсах. Ці не атрымаецца ўрэшце так, што прыгожая "абгортка" стане важнейшай за сэнсавае напаўненне?**

— Толькі не з нашым чытачом! У нас столькі пакаленняў ужо выхавана на добрай літаратуры, што прыгожай вокладкай, у якой будзе нікчэмнае напаўненне, нікога не завабіш. І выдаўцы гэта выдатна разумеюць, таму «кантроль якасці» пачынаецца яшчэ з рукапісаў... Але чаму б сёння, калі паліграфія мае такія тэхнічныя магчымасці, прыгожа не аздобіць добрую кнігу? Тым больш гэта зноў жа наша спрадвечная нацыянальная традыцыя. Скарыну было б прасцей выдаваць кнігі без гравюр: кнігі Святога пісання ў той час і без ілюстрацый знайшлі б чытача. Але наш першадрукар стараўся, каб чалавек, які возьме ў рукі яго кнігу, атрымліваў задавальненне не толькі ад чытання, але і ад таго, што трымае яе... Па-мойму, вельмі добрая традыцыя, і адмаўляцца ад яе ніякім чынам нельга!

**— Сёлета ўпершыню будзе ўручана Нацыянальная літаратурная прэмія. Ці стане яна, на вашу думку, для айчынных літаратараў стымулам пісаць больш і цікавей?**

— Тое, што ў краіне з'явілася Нацыянальная літаратурная прэмія, — гэта зусім не даніна модзе, як лічаць некаторыя скептыкі (маўляў, ёсць і тэатральная, і музычная, дык зрабілі і літаратурную). Гэта найперш сведчанне таго, што ў краіне ёсць якасная літаратура і добрыя пісьменнікі, якіх чытаюць. У адрозненне ад іншых узнагарод, што могуць атрымаць нашы майстры мастацкага слова, лёс гэтай прэміі для літаратараў вырашаюць яны самі. У гэтым яе адрозненне, у гэтым і яе каштоўнасць, бо прафесіяналы вельмі раўніва ставяцца да творчасці калег, і калі ўжо выбіраюць, дык сапраўды найлепшых. Несумненна, аўтары будуць імкнуцца атрымаць падобнае прызнанне. Наміналты першай прэміі ўжо вядомы, у Шчучыне назавуць лаўрэатаў. Не буду раскрываць інтрыгу, але параю: абавязкова пачытайце тыя творы, аўтары якіх атрымаюць прэмію. Не пашкадуеце.

**— У Год моладзі на свяце маладым творцам і чытачам будзе нададзена нейкая асаблівая ўвага?**

— Моладзі — і аўтарам, і чытачам — асаблівая ўвага надаецца на кожным свяце беларускага пісьменства. Гэты год не будзе выключэннем. Мы ўжо другі раз падвядзём вынікі акцыі «Лета з добрай кнігай», якую Міністэрства інфармацыі ладзіць сумесна з вядучымі выдавецтвамі краіны. Падчас летніх канікул пісьменнікі і выдаўцы выязджаюць у месцы, дзе адпачываюць дзеці, знаёмяць юных чытачоў з цікавымі кнігамі і іх аўтарамі. Такія сустрэчы дарагога варты: дзеці заўжды праяўляюць непадробную цікавасць, з'яўляецца ўпэўненасць, што кніга стане для іх гэткім самым добрым сябрам, як смартфон ці планшэт... Пра тое, што моладзь цікавіцца літаратурай, сведчыць і шчыры інтарэс школьнікаў да конкурсу «Жывая класіка» — удзельнікі чытаюць мастацкія творы, праяўляючы свае творчыя здольнасці, выказваючы ўласнае разуменне прачытанага. У Шчучыне можна будзе пачуць найлепшых чытальнікаў Гродзеншчыны...

**— У Шчучыне напярэдадні свята на будынку школы з'явілася маштабная выява Францыска Скарыны. Мы ўжо рыхтуемся да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання?**

— Увогуле, сёлетняе свята пройдзе пад знакам 70-годдзя Вялікай Перамогі. Гэта абсалютна правільна: такая дата здараецца не кожны год, да таго ж сёння, як ніколі, асабліва актуальна яшчэ раз сказаць пра неабходнасць памятаць урокі Вялікай Айчыннай, таму што мы бачым, да чаго можа прывесці забыццё, на прыкладзе нашых суседзяў па планеце. Да таго ж беларускія майстры слова гэтай тэме і адразу пасля вайны, і сёння надаюць вельмі важнае значэнне, зрэшты, у нашай краіне, якая найбольш пацярпела ад фашызму, інакш і быць не можа. Таму многія мерапрыемствы і творчыя сустрэчы будуць звязаны на Дні пісьменства з юбілеем Перамогі.

Што датычыцца юбілею беларускага кнігадрукавання, які будзем адзначаць праз два гады... Падрыхтоўка распачалася, бо дата знакавая. І Скарына на свяце ў Шчучыне абавязкова будзе прысутнічаць. Зрэшты, як і заўсёды. Калі вы бачылі Дзень беларускага пісьменства без нашага першадрукара?

**Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

*alena@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

У Шчучыне 31 жніўня да Дня беларускага пісьменства адкрылася кнігарня-кавярня «Несцерка». Сярод першых наведвальнікаў кнігарні — міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Аляксандр ВАШКЕВІЧ, старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК і, вядома ж, чытачы, сярод якіх шмат дзяцей і моладзі.

■ Парламенцкі дзённік

# ІРАНСКІ ПАРЛАМЕНТ ПАШЫРАЕ АБМЕН ДЭЛЕГАЦЫЯМІ

**Днямі Палату прадстаўнікоў наведалі прадстаўнікі Камісіі па судова-прававых пытаннях Сходу ісламскага савета (парламента) Ісламскай Рэспублікі Іран**

**Візіт гэты на чале са старшынёй камісіі Алах'ярам Малекшахі адбыўся літаральна праз тыдзень пасля наведвання Палаты прадстаўнікоў кіраўніком групы дружбы іранскага парламента. Разам з тым члены дэлегацыі пацвердзілі, што зараз рыхтуецца афіцыйны візіт Старшыні Савета Рэспублікі ў Іран, і запрасілі наведаць сваю краіну калег з Палаты прадстаўнікоў.**

— Мы вельмі даражым нашымі адносінамі з буйной краінай, якая мае вялікае палітычнае значэнне ў сваім рэгіёне, — вітаў гасцей **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталій БУСЬКО.** — Нацыянальны сход Беларусі вельмі зацікаўлены ў наладжванні самых цесных і ўсебаковых сувязяў з парламентам вашай краіны. Для сённяшняй сустрэчы ўжо маецца добры фундамент, і візіт вашай дэлегацыі дасць новы імпульс для развіцця двухбаковых адносін.

У сваю чаргу, Алах'яр Малекшахі падрабязна расказаў пра ролю Сходу ісламскага савета ў сваёй краіне. «Іранскі парламент складаецца з 290 дэпутатаў, якія выбіраюцца народам на чатыры гады, — сказаў ён. — У парламенце маецца 15 камісій, члены якіх абавязкова з'яўляюцца спецыялістамі ў сферы, за якую адказвае пэўная камісія. Так, усе члены Камісіі па судова-прававых пытаннях, адной з самых важных у парламенце, з'яўляюцца суддзямі. Усё, што датычыцца заканадаўства і Канстытуцыі, — у руках парламента. Тое, што ратыфікаваў парламент, выканаўчая ўлада абавязана выконваць. Парламент таксама назірае за рэалізацыяй прынятых законаў».

Дэпутаты Сходу ісламскага савета пастаянна робяць заўвагі, рэкамендацыі і рэмаркі ў адрас свайго ўрада і Прэзідэнта, яны таксама маюць права прадстаўляць апошняга, а таксама любога міністра да імпічменту. «У той жа час у Іране, згодна з Канстытуцыяй, няма ніводнай сілы, якая магла б распусціць парламент», — заўважыў Алах'яр Малекшахі.

«У нашы дні парламенцкая дыпламатыя адыгрывае вельмі важную ролю ў свеце, — сказаў кіраўнік іранскай дэлегацыі. — Міжпарламенцкія адносіны звычайна бываюць больш цесныя, чым адносіны паміж урадамі. І мы дзякуем Богу, што ў апошнія гады парламенцкія адносіны паміж Іранам і Беларуссю добра развіваліся. Вашу краіну наведаў спікер нашага парламента, а таксама кіраўнік групы дружбы. Зараз мы арганізуем афіцыйны візіт спікера вашага парламента. І, карыстаючыся магчымасцю, запрашаю ў Іран усіх прысутных — мы прымем вас, як сваіх».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*medvedeva@zviazda.by*

■

# ПАЛІВА ПАКУЛЬ НЕ ПАДАРАЖЭЭ

**Як зазначыў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід АНФІМАЎ, у апошні час у розныя дзяржаўныя органы звяртаюцца грамадзяне, занепакоеныя магчымым павышэннем цэн на тавары і паслугі. У сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі даручыў Камітэту дзяржкантролю правесці маштабны маніторынг абставін з цэнаўтварэннем і за некалькі дзён вывучыць гэта пытанне. У дачыненні да паліва пакуль такіх праблем няма.**



Сёлетні год адметны тым, што ад яго пачатку цэннік на гаручае вырас усяго аднойчы — 13 студзеня. Варта нагадаць, што тады ў краіне дзейнічала жорсткая прывязка кошту бензіну АІ-92 да курса долара. Аднак перыяд нізкіх цэн на нафту на сусветным рынку нечакана зацягнуўся: кошт гатунку BRENT з тае пары неаднаразова тэсціраваў адзнаку ў 50 долараў за бараль у бок паніжэння, пры гэтым крывая графіка так і не прабіла на піках мяжу хаця б у 70.

## СТАЛІ МЕНШ КУПЛЯЦЬ

— Пры гэтым праведзены намі аналіз паказаў, што эфекту ад такой прывязкі няма пры коште нафты, ніжэйшым за 80 долараў, — зазначыў **намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім» Віталь ПАЎЛАЎ**. — Больш за тое, бягучая эканамічная сітуацыя як Беларусі, так і суседніх краін не дазваляе нам працаваць па такім прынцыпе. Таму прывязка і была скасавана. Ды і ўзровень коштаў за мяжой уносіць свае карэктывы. Зараз у нас паліва на запраўках крыху даражэйшае, чым у Расіі, але значна таннейшае, чым у краінах Балтыі і ў Польшчы.

Разам з тым пламежныя АЗС прадалі ад пачатку года на 25-30% менш паліва ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. На ўнутраным рынку падзенне крыху меншае — 20%. Зніжаецца і прыбытковасць продажаў паліва.

— Звязана гэтая тэндэнцыя з многімі фактарамі. Гэта і сусветнае падзенне коштаў на нафту, і паніжэнне эканамічнай актыўнасці, ды і цэнавы фактар адыграў сваю ролю.

## АПЛАТА ПАСТАВАК НАФТЫ — РУБЛЯМІ ПА КУРСЕ

Расійскую валюту сёлета назваць стабільнай не выпадае. Курс яе змяняўся ад 50 да 70 рублёў за долар. У той жа час шмат прадуктаў нафтаперапрацоўкі экспартуецца ў Расію. Як жа тамтэйшая эканамічная сітуацыя адбілася на нафтавым сектары беларускай эканомікі?

— Мы разлічваемся за нафту расійскімі рублямі, як і за сыравіну, што купляецца для газаперапрацоўчага завода, але аплачваем пастаўкі, зыходзячы з бягучага курса долара, — зазначыў **генеральны дырэктар беларускай нафтавай кампаніі Аляксандр ДЗЯМІДАЎ**. — Пры гандлі на расійскіх біржах, пастаўках па прамых дамовах мы заўжды звяртаем увагу на бягучы курс долара, а таксама курс магчымай канвертацыі рубля ў валюту. Дзякуючы гэтаму з прычыны аслаблення курса рубля нашы продажы не пацярпелі.

Летась у кастрычніку Савет міністраў Саюзнай дзяржавы зацвердзіў баланс паліўна-энергетычных рэсурсаў на 2015 год. За перыяд дзеяння дакумента Расія мусіць паставіць у Беларусь 23 мільёны тон нафты. Наша ж краіна абавязвалася паставіць на расійскі рынак 1,8 мільёна тон аўтамабільных бензінаў. Як жа ідзе справа цяпер, калі 2/3 года ўжо адышлі ў гісторыю? Віталь Паўлаў адзначыў, што Беларусь сёлета паставіла ў Расію 614 тысяч тон бензінаў, улічваючы эканамічны складнік.

— Пастаўкі на расійскі рынак могуць крыху зменшыцца ў параўнанні з мінулым годам. Але гэта будзе азначаць толькі тое, што наша прадукцыя не была запатрабавана напоўніцу. Справа ў тым, што аб'ём паставак залежыць не толькі ад кошту, але і ад запатрабаванасці ў пэўны прамежак часу. Напрыклад, калі склаўся нейкі дэфіцыт, то рынак на гэта адразу ж адрэагуе.

Агулам жа экспарт нафтапрадуктаў падрос у параўнанні з мінулым годам амаль на паўтара мільёна тон. Сальда знешняга гандлю таварамі па канцэрне «Белнафтахім» атрымалася станоўчым і дасягнула адзнакі ў 2,9 мільярда долараў.

## НАВОШТА ІМПАРТ, КАЛІ ЁСЦЬ СВАЁ?

Бензін з актанавым чыслом 98 заліваецца пераважна ў бакі аўтамабіляў класа «Прэміум». Дазволіць сабе пакупку такога «жалезнага каня» можа далёка не кожны. Таму і на айчынным рынку доля рэалізацыі АІ-98 была мінімальнай. Разам з тым пэўны попыт на яго існаваў. Завозілі сюды гэты бензін са Скандынавіі і Расіі. Цяпер жа неабходнасці ў імпарце няма — «Беларуснафта» сёлета пачала выпускаць уласны АІ-98. І больш за тое, ён ужо знайшоў пакупнікоў па-за межамі краіны: ва Украіне і ў Расіі.

— У нас увесь аб'ём маторнага паліва выпускаецца толькі з патрабаваннямі экалагічных стандартаў Еўрасаюза і тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза, — зазначыў Віталь Паўлаў. — На ўнутраным рынку прадаецца гаручае толькі самага высокага класа 5.

Сёлета «Беларуснафта» мяркуе здабыць з айчынных нетраў больш за 1,6 мільёна тон нафты. Пакуль жа на паверхню было паднята 958 тыс. тон. Пры гэтым аб'ём першаснай перапрацоўкі нафты на заводах склаў 13,6 мільёна тон.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Дзве нафтатранспартныя арганізацыі — «Гомельтранснафта Дружба» і «Полацктранснафта Дружба» — пачалі рэалізоўваць буйнамаштабныя інвестыцыйныя праекты. Хутка ў Беларусі з'явяцца два магістральныя нафтапрадуктаправоды. Адзін з іх («Наваполацк — Фаніпаль») ужо будуецца. Другі, па трасе «Мазыр — Бернады — Прылукі», пакуль знаходзіцца на завяршальнай стадыі праектавання. Будзе скончана рэканструкцыя Беларускага газаперапрацоўчага завода. На Мазырскім НПЗ запрацуе камбінаваная ўстаноўка, на якой будуць выпрацоўвацца высокаактанавыя кампаненты бензінаў.

## ЗАПРАЎКА — СТАРТ ДЛЯ ПАДАРОЖЖА?

«Беларуснафта» анансуе запуск новага турыстычнага праекта для аўтападарожнікаў. Сярод шматлікіх прыватных ініцыятыў гэта першая комплексная праграма, скіраваная на папулярызацыю індустрыі ўнутранага турызму. Праект атрымае назву «Belarus N».

— Можам называць праект паразнаму: «Беларусь Невядомая» ці «Беларусь Новая», — дзеліцца **намеснік генеральнага дырэктара «Беларуснафты» Сяргей КАМОРНІКАЎ**. — Сутнасць яго ў тым, што мы жадаем большую частку нашых аўтазаправачных станцый ператварыць у пункты, з якіх пачнецца падарожжа па краіне. З дапамогай інтэрнэт-партала і мабільнага дадатка можна будзе даведацца, якія славутасці, дзіўныя прыродныя аб'екты, помнікі архітэктуры, сядзібы знаходзяцца ў радыусе 30 кіламетраў ад запраўкі. Адначасова мы праектуем адмысловыя тэматычныя маршруты. Распрацоўка партала скончыцца ў кастрычніку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**
*schklennik@zviazda.by*

---

■ Напярэдадні падзеі

# Выкарыстоўваць энергію разумна

## Тысяча дэлегатаў прыбудзе ў Мінск на 79-ю Генеральную асамблею МЭК

**Упершыню наша краіна будзе прымаць найбуйнейшы тэхнічны і бізнес-форум — 79-ю Генеральную асамблею Міжнароднай электратэхнічнай камісіі (МЭК). Мерапрыемства пройдзе з 5 па 16 кастрычніка 2015 года ў Мінску.**

«Дэлегаты — гэта прадстаўнікі вядучых сусветных кампаній у галіне электрычных, электронных і сумежных тэхналогій, міжнародныя, рэгіянальныя і нацыянальныя арганізацыі ў сферы тэхнічнага рэгулявання, стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці, а таксама навуковыя ўстановы», — падкрэсліў у прэс-службе Дзяржстандарта.

Праграма асамблеі змястоўная: пытанні міжнароднай тэхнічнай палітыкі ў гэтых найважнейшых сектарах эканомікі і сусветнага гандлю будуць абмяркоўвацца на пасяджэннях Савета МЭК і тэхнічных камітэтаў і падкамітэтаў па стандартызацыі, семінарах і форумах, у рамках дыскусій і азнаямленчых візітаў.

— У рамках форуму адбудуцца пасяджэнні 29 тэхнічных камітэтаў/падкамітэтаў па стандартызацыі МЭК. У іх рабоце возьмуць удзел звыш 900 экспертаў з розных краін свету, у тым ліку больш за 140 — з Беларусі, — адзначылі ў прэс-службе камітэта. — Для большасці беларускіх спецыялістаў удзел у такіх пасяджэннях стане неацэнным вопытам, крыніцай сучасных ведаў і пашырэння дзелавых кантактаў, якія дазволяць падняцца на новыя прыступкі прафесійнай кампетэнтнасці.

Асноўнымі тэмамі асамблеі сталі «Разумнае выкарыстанне энергіі для павышэння якасці жыцця» і «Адзіныя патрабаванні і ацэнка адпаведнасці — ключавыя ўмовы міжнароднага гандлю». Іх актуальнасць ва ўмовах больш жорсткай канкурэнцыі, укаранення інавацыйных тэхналогій, а таксама неабходнасці рацыянальных адносін да рэсурсаў і навакольнага асяроддзя бясспрэчная.

Апроч гэтага, яшчэ адным асабліва цікавым мерапрыемствам, без сумненняў, стане Форум маладых спецыялістаў МЭК, які адкрывае дзверы моладзі для прафесійнага росту і далейшай інтэграцыі ў дзейнасць гэтай міжнароднай арганізацыі.

Мяркуецца, што ў рамках асамблеі пройдуць розныя семінары спецыяльна для краін — членаў Міждзяржаўнага савета па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі дзяржаў — удзельніц СНД (МДС). «Узаемны абмен інфармацыяй і вопытам паміж экспертамі будзе спрыяць павышэнню дасведчанасці аб работах, якія праводзяцца, а таксама дазволіць вызначыць новыя напрамкі для развіцця супрацоўніцтва», — адзначылі ў прэс-службе Дзяржстандарта.

Міжнародная выстава «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра» (EnergyExpo 2015) і Беларускі энергетычны і экалагічны кангрэс, якія пройдуць адначасова з 79-й Генеральнай асамблеяй МЭК, пашыраць магчымасці для ўстанаўлення шматбаковых кантактаў.

**Дар'я ШОЦІК**

■

---

■ Пад кантролем

# ЗНАЙШЛІ СТАРАЖЫТНЫЯ ГЕМІДРАХМЫ

**У паштовым адпраўленні былі выяўлены манеты IV стагоддзя да нашай эры. Іх перасоўванне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза спынілі ў пункце мытнага афармлення «Мінскай пошты».**

— Пры правядзенні мытнага кантролю міжнароднага паштовага адпраўлення, якое паступіла з Ізраіля на адрас жыхара Мінска і не суправаджалася мытнай дэкларацыяй устаноўленай формы, былі знойдзены тры манеты, — паведаміла **старшы інспектар аддзела ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні Кацярына ШЫНЯЎСКАЯ**.

Знаходку накіравалі на экспертызу. Згодна з заключэннем спецыялістаў, манеты былі выраблены са сплаву серабра (90 працэнтаў) і медзі і маюць гістарычную і музейную каштоўнасць. Гэта манеты фракійскага Херсанеса, якія называюцца гемідрахмамі, выраблены ў IV стагоддзі да нашай эры.

# ХАВАЛА КРАДЗЕНАЕ ПАД ШАЛІКАМ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы за крадзеж з крамы рэчаў затрымалі жанчыну. А дапамаглі ім у гэтым пільныя прадаўцы.**

— Паводзіны адной з пакупніц, якая зазірнула ў краму па вуліцы Харужай, прымусілі работнікаў гандлю засумнявацца ў яе прыстойнасці. Жанчына доўга хадзіла паміж радамі, дэталёва аглядаючы асартымент трыкатажнага адзення. На перадплеччы ў пераборлівай кліенткі быў вялікі шалік. Адзін з прадаўцоў заўважыў, што яго таўшчыня пакрысе павялічваецца, — распавяла **прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра ПАПОВА**. — Ён пачаў назіраць за пакупніцай, а другі работнік стаў каля выхада з крамы. Калі жанчына сабралася сысці, апошні папрасіў яе разматаць шалік. Пад ім на руцэ вісела пяць найменняў трыкатажных вырабаў. Прадаўцы адразу выклікалі міліцыю. За крадзеж жанчыне пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

---

■ Запрашальнік

# СВЯТА ХРУСТКАЙ СКАРЫНАЧКІ

**У сталіцы 5 верасня пройдзе першы хлебны фестываль.**

Мерапрыемства пад назвай «Свята хлеба» адбудзецца ў парку імя М. Горкага. На фестываль сваю прадукцыю прадставяць шэсць хлебазаводаў прадпрыемства «Мінскхлебпрам». Яны прадэманструюць навінкі вытворчасці, правядуць майстар-класы па лепцы розных фігурак, круасанаў, слоек з дражджавога, слоенага цеста, а таксама з рознакаляровай масцікі. Удзельнікам фестывалю дадуць магчымасць самім спячы хлеб, булачкі, круасаны і іншыя вырабы, а таксама сфатаграфавацца ў ролі пекара.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

---

■ Ну і ну!

# 428 ПАЧКАЎ КАВЫ ДЛЯ «АСАБІСТАГА КАРЫСТАННЯ»?

**Толькі за апошні тыдзень выяўлена 5 фактаў збору і захоўвання тавараў, якія ўвезены з Польшчы быццам для асабістага карыстання, агульным ацэначным коштам каля 160 мільёнаў рублёў.**

Пад увагу мытнікаў трапілі, у прыватнасці, два жыхары Ваўкавыска, якія з'яўляліся арганізатарамі такога ўвозу тавараў. Гараж і кватэра выкарыстоўваліся як склад для абутку, штаноў і сумак адпаведна на 46 і 38 мільёнаў рублёў. Уражваюць і запасы кавы для «асабістых патрэб»: у легкавіку жыхаркі абласнога цэнтра выявілі 416 пачкаў, у гаражы іншага гродзенца — 428. Ва ўсіх выпадках не мелася дакументаў, якія б пацвярджалі легальнасць захоўвання тавараў. Відавочна, што яны прызначаліся для камерцыйных мэт. Таму, як паведамляе прэс-служба Гродзенскай рэгіянальнай мытні, «левыя» тавары ў парушальнікаў забралі, а матэрыялы па ўсіх фактах перададуць у суд.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■

■ На ўвесь свет

# «КОЛА ЖЫЦЦЯ» — У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

9 верасня тысячы гасцей з усяго свету змогуць стаць удзельнікамі Нацыянальнага дня Рэспублікі Беларусь на «ЭКСПА-2015»

**Чатыры месяцы работы Сусветнага форуму харчавання «Накармі планету. Энергія жыцця» ў Мілане пераўзышлі ўсе чаканні арганізатараў: колькасць наведвальнікаў выставы вылічаецца сямізначнай лічбай, а натоўп ахвотных убачыць сваімі вачыма самыя перадавыя дасягненні з прадстаўленых тут 144 краін меншым не становіцца.**

Прадстаўнікі розных куткоў зямнога шара, якім пашчасціла трапіць на «ЭКСПА», гатовыя выстойваць доўгія чэргі, каб убачыць найноўшыя цуды тэхнікі або пакаштаваць смачныя стравы нацыянальных кухняў.

Пры такой вялікай разнастайнасці ідэй, тэхналогій, этнічнага каларыту, як адзначаюць арганізатары выставы, беларускі павільён уваходзіць у дзясятку найбольш наведвальных! Наша «Кола жыцця», а ў цэлым — прадуманы да дробязяў дызайн экспазіцыі, нязменна прыцягваюць вялікую колькасць наведвальнікаў. Атрымаць рознабаковую інфармацыю пра Сінявокую, акунуцца ў атмасферу яе фальклору, пакаштаваць смачных дранікаў штодня сюды заходзяць тысячы людзей.

Наперадзе яшчэ два месяцы працы, і яны для беларускага прадстаўніцтва на выставе стануць надзвычай насычанымі.

**Дырэктар Нацыянальнага павільёна Беларусі на «ЭКСПА-2015» Наталля КУРАШ** адзначае:

— «Нацыянальны дзень Рэспублікі Беларусь стане яркай падзеяй і прыцягне ўвагу і турыстаў, і дзелавых людзей да нашай краіны. Мы падрыхтавалі вялікую праграму, якая максімальна поўна прадставіць патэнцыял рэспублікі ў самых розных сферах яе жыццядзейнасці. У гэты дзень чакаецца візіт на выставу беларускай урадавай дэлегацыі на самым высокім узроўні, а таксама кіраўнікоў шэрагу буйных беларускіх прадпрыемстваў. Запланаваны бізнес-сустрэчы і шматбаковыя дзелавыя перамовы. Акрамя таго, у нашым павільёне будзе прадстаўлена выстаўка-дэгустацыя беларускіх прадуктаў харчавання, у першую чаргу кандытарскай і мяса-малочнай прадукцыі. А бліжэй да вечара адбудзецца вялікі гала-канцэрт «Беларусь запрашае!» з удзелам вядучых творчых калектываў нашай краіны. Усіх, каму пашчасціць наведаць у гэты дзень наш павільён, чакаюць падарункі і сюрпрызы!

Зрэшты, наступныя дні таксама стануць асаблівымі: 10 і 11 верасня на «ЭКСПА» пройдуць Дні горада Мінска. Будзе шырока прадстаўлены гандлёва-прамысловы, турыстычны і культурны патэнцыял беларускай сталіцы.




Наталля Кураш лічыць, што для Беларусі такі актыўны ўдзел у «ЭКСПА-2015» — гэта ўдалая магчымасць прадэманстраваць поспехі і дасягненні нашай краіны літаральна на ўвесь свет і знайсці новых партнёраў за мяжой. Што ж тычыцца асноўнай тэмы форуму: «Накармі планету. Энергія жыцця», то тут Беларусі сапраўды ёсць што прапанаваць, і гэта нязменна адзначаюць наведвальнікі і арганізатары форуму.

Дарэчы, за мінулыя месяцы ўжо прайшлі прэзентацыі Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей і Дзень беларускай эканомікі. У выніку паміж рэгіёнамі і замежнымі партнёрамі былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве ў самых розных сферах.

**Таццяна УЛАДЗІМІРАВА.** *Мілан*

## ХАЛАДНАВАТА І ДАЖДЖЫ, МЕСЦАМІ — МОЦНЫЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

З панядзелка па сераду спецыялісты прагназуюць на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5-11 градусаў, удзень — 13-20 цяпла.

Сёння эксперты Белгідраметцэнтра падвялі вынікі анамальна спякотнага і сухога жніўня. Такім чынам, сярэдняя за месяц тэмпература паветра склала 18-23 градусы цяпла, што на 2-5 градусаў вышэй за кліматычную норму. Паведамляецца, што 8 жніўня на метэастанцыях Мінск і Ашмяны, а 9 жніўня ў Пружанах, Высокім і Брэсце зафіксаваны новыя абсалютныя тэмпературныя максімумы месяца. З ападкамі ў мінулым месяцы была ўвогуле бяда. На пераважнай частцы краіны ў жніўні выпала ўсяго ад 1% да 25% месячнай нормы, і толькі на некаторых метэастанцыях колькасць ападкаў склала каля паловы месячнай нормы. Такога сухога жніўня ў Беларусі не адзначалася ніколі за ўвесь пасляваенны перыяд назіранняў. На працягу месяца з прычыны сухога і гарачага надвор'я захоўвалася складанае становішча ў лясах.

Нагадаю, што вельмі цёплае, а па поўдні краіны і гарачае надвор'е захоўвалася ў першыя дні восені. Фон сярэднясутачных тэмператур перавышаў кліматычную норму ажно на 2-12 градусаў. Тады максімальныя тэмпературы ў большасці раёнаў дасягалі плюс 28-34 градусаў, а па поўдні краіны паветра награвалася да 35-36 цяпла. Менавіта першага верасня краіна атрымала новыя рэкорды абсалютнай максімальнай тэмпературы паветра ў гэтым месяцы. Тады на метэастанцыі Жыткавічы было зафіксавана плюс 35,6 градуса.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# «ПЕРШАМАЙСКАЯ» БУЛЬБА

**Завяршаючы гэтае лета, многія жыхары краіны апошнія выхадныя жніўня адзначылі ўдарнай працай на бульбяных палетках. Праз летнюю спёку, якой, здавалася, не будзе канца, некаторыя гаспадары ўжо не спадзяваліся на добры ўраджай другога хлеба. Аднак першыя ўзараныя бульбяныя барозны паспелі развеяць песімістычныя настроі — бульба не падвяла, не расчаравала агароднікаў.**



Прынамсі, на полі перад вёскай Першамайск на Уздзеншчыне. Гэты ўчастак быў аддадзены работнікам мясцовага сельскагаспадарчага прафесіянальнага ліцэя, і цяперашнім, і былым: выкладчыкам, майстрам вытворчага навучання і рабочым. У суботу і нядзелю з самага ранку і да вечара на бульбяным полі панаваў дзелавы настрой.

На участку Алены Дзенгубенкі сабраліся яе сваякі, каб хутчэй выкапаць бульбу на дзесяці сотках і ўправіцца за адзін дзень. Так і ў іншых сем'ях, якія прыйшлі на першамайскае поле.

— Мы прыехалі амаль у 7 гадзін раніцы і плануем пасля апоўдня завяршыць дакопкі, — кажа гаспадыня баразён, не адрываючыся ад працы. — На надвор'е і ўраджай не наракаем. Адно толькі пыл перашкаджае працаваць, лезе ў вочы і рот — першы раз у жыцці бачу такую сухую зямлю.

Адміністрацыя ўстановы выдзеліла трактар для копкі бульбы, і людзям не трэба было пра гэта клапаціцца.

Пройдзе «Беларус» па 260-метровай баразне — уся бульба на паверхні, збірай, не лянуйся.



**Івану ЗЯНЕВІЧУ — былому намесніку дырэктара ліцэя** — даводзіцца на полі не толькі збіраць бульбу, а яшчэ і адвозіць сабраны ўраджай на сваім самаробным міні-трактары. 35 гадоў таму гэты майстравіты механік зрабіў надзейнага жалезнага памочніка. Дапамагае Іван Зяневіч таксама і суседзям, аднавяскоўцам, былым калегам. Пра свой ураджай Іван Іванавіч кажа: «Мы пасадзілі 12 мяхоў сеянкі, а атрымалі амаль 40. Хопіць на ўсю зіму».

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**
*Уздзенскі раён.*





■ Добрая навіна

## ПІНГВІНЫ СТАЛІ БЛІЖЭЙШЫЯ

Беларусь атрымала ключавы статус для асваення Антарктыкі

**У апошнія дні жніўня ў нарвежскім горадзе Трамсё адбылося чарговае пасяджэнне Савета кіруючых нацыянальных антарктычных праграм (COMNAP), на якім разглядалася пытанне аб уваходжанні Беларусі ў склад пастаянных членаў гэтай арганізацыі. Удзел у мерапрыемстве ўзяў і прадстаўнік Нацыянальнай акадэміі навук, кіраўнік беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ, які прадставіў інфармацыю аб дзейнасці нашай краіны на кантыненце.**

Усе 29 дзяржаў, якія ўжо з'яўляюцца пастаяннымі членамі COMNAP, прагаласавалі за наданне Беларусі такога ж статусу. Такім чынам, мы сталі трыццатай краінай, што ўваходзіць у самую ўплывовую арганізацыю ў сістэме Дагавора аб Антарктыцы.

Новы статус адкрые перад беларускімі палярнікамі новыя магчымасці. У першую чаргу размова ідзе пра ўдзел у абмеркаванні будучай навуковай і практычнай дзейнасці на ледзяным кантыненце. Акрамя гэтага, Беларусь зможа карыстацца агульнымі транспартнымі і лагістычнымі схемамі краін — удзельніц Дагавора аб Антарктыцы і, адпаведна, рэалізоўваць больш маштабныя навуковыя і тэхнічныя праекты. Варта таксама заўважыць, што пастаяннае членства ў COMNAP з'яўляецца вырашальным фактарам для наступнага кроку ў асваенні краінай Антарктыкі — атрымання статусу Кансультатыўнага боку Дагавора аб Антарктыцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

70 гадоў 1945-2015 Вялікай Перамогі

# ГАЗЕТА Ў БОЙ ВЯЛА І КЛІКАЛА: «УПЕРАД!»

**Беларускі друк перыяду Вялікай Айчыннай вайны — значная сіла народа ў барацьбе з акупантамі. Публіцыстычная спадчына журналістаў і пісьменнікаў, якія штодзённа рызыкавалі сваім жыццём, з'яўляецца сапраўды гераічнай старонкай у гісторыі змагання беларускага народа з фашызмам. Беларусь, як вядома, адна з першых прыняла на сябе ўдары захопнікаў. Важную ролю ў арганізацыі супрацьстаяння ворагу адыграў перыядычны друк.**

Зброяй супраць гітлераўцаў было і вострае слова, якое прыраўноўвалася да штыка, якім пісьменнікі, журналісты, аўтары з франтоў і партызанскіх атрадаў па-майстэрску змагаліся. Вядомыя словы Уладзіміра Маякоўскага «я хачу, каб да штыка прыраўнялі пяро» ў гады ваеннага ліхалецця перасталі быць метафарай.

У гарадах Беларусі было шмат партызанскіх атрадаў, у якіх выпускаліся лістоўкі, рукапісныя газеты... Тычыцца гэта і горада Ліды.

18 верасня 1939 года Чырвоная Армія заняла Ліду. Пачалася Другая сусветная вайна. Друкарні былі нацыяналізаваны, перасталі выходзіць газеты. І ўжо праз 13 дзён, 30 верасня 1939 года, выйшаў першы нумар газеты «Уперад», якая заклікала народ паўстаць супраць ворага, ні кроку адступлення. Газета «Уперад» была органам часовага кіравання горада Ліды і Лідскага павета, а потым стала органам гарадскога і раённага камітэта КП(б)Б. У той час, як выйшаў першы нумар, рэдактарам быў Б.Э. Абрамзон (да красавіка 1940 года, загінуў у 1942-м у Сталінградзе), а пазней ім былі Швантэйн і Капулкін, Кулінецка. Але ж, на жаль, першыя нумары не захаваліся. У бібліятэцы імя Леніна ў Маскве архіўная падшыўка газеты «Уперад» пачынаецца з №12 за 2 лістапада 1939 года.

Той час быў бурным, бо ўсталёўвалася новая, савецкая, улада на былых заходніх крэсах. Газета і тады змагла выстаяць. Аб гэтым гаворыць адзін факт. Рэспубліканская газета «Звязда» ў №275 за 29 лістапада 1939 года ў рубрыцы «Бальшавіцкі друк заходніх абласцей БССР у барацьбе за новае жыццё» пад загалоўкам «Глыбей асвятляць новае жыццё» пісала: *«Перад намі два калектывы газет: лідскай «Уперад» (рэдактар таварыш Абрамзон) і маладзечанскай «Чырвоны сцяг» (рэдактар таварыш Багданаў). Па фармаце яны аднолькавыя, поле дзейнасці іх таксама аднолькавае, але розніца паміж імі вялікая... Газета «Уперад» — жывая, цікавая. На яе старонках можна бачыць імёны дзясяткаў мясцовых аўтараў, якія пішуць па розных хвалюючых пытаннях. У газеце адлюстроўваецца кіпучае жыццё, якім жыве горад Ліда з яго дваццацітысячным насельніцтвам»*. Гэта была высокая ацэнка лідскай газеты. Яна давала натхненне творчым супрацоўнікам рэдакцыі і пазаштатным карэспандэнтам, узнімала іх настрой. У рэдакцыі ў той час працавалі паэты Валянцін Таўлай, Ніна Тарас, Якуб Міско.

У Лідскім гісторыка-мастацкім музеі захаваліся ўспаміны шафёра даваеннай рэдакцыі газеты «Уперад» Георгія Віннічка. Вось што ён занатаваў:

*«...Першым рэдактарам Лідскай газеты «Уперад» быў Абрамзон, пасля яго — Капулкін. Капулкін да рэдакцыі працаваў у райвыканкаме, а пасля стаў рэдактарам. Абрамзон некуды выехаў. Капулкін працаваў месяцы 3-4. Потым прыслалі новага рэдактара — Кулiненку. Яго жонка пачала працаваць у райвыканкаме. Першымі работнікамі рэдакцыі былі: Б. Э. Абрамзон, сакратар Леўкавец, журналіст Петрачкоў і я шафёрам. Потым прыслалі Таўлая, Разанава (з Вільні), Ніну Тарас і ў 1941 г. — Міско. Рэдакцыя размяшчалася на цяперашняй вуліцы Савецкай, супраць камбіната харчовых канцэнтратаў. Метраў на 100 вышэй (на поўнач) была друкарня.*

*У друкарні ў асноўным працавалі яўрэі, яны загінулі ў вайну. Спачатку ўсе работнікі размяшчаліся разам з Часовым упраўленнем у будынку Старонства, на месцы цяперашняй школы №8 (на 1967 год). Па першым часе, калі яшчэ размяшчаліся ў Старостве, мы ездзілі па раёне і агітавалі. Вазілі з сабой улёткі, цэнтральныя газеты. Дзе друкаваліся ўлёткі, я не ведаю».*


ЛЕНИН И СТАЛИН — ОРГАНИЗАТОРЫ И ВДОХНОВИТЕЛИ БОЛЬШЕВИСТСКОЙ ПЕЧАТИ

Смерть немецким акупантам!

Уперад

ОРГАН ЛІДСКАГА ГАРКОМА І РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 19 (45) Пятница 5 мая 1944 г.

Прочитай и передай другому.

Печать — единственное орудие, при помощи которого партия ежедневно, ежечасно говорит с рабочим классом на своем, нужном ей языке. Других средств протянуть духовные нити между партией и классом, другого такого гибкого аппарата в природе не имеется.

СТАЛИН

ГАЗЕТА — НЕ ТОЛЬКО КОЛЛЕКТИВНЫЙ ПРОПАГАНДИСТ И КОЛЛЕКТИВНЫЙ АГИТАТОР, НО ТАКЖЕ И КОЛЛЕКТИВНЫЙ ОРГАНИЗАТОР.

ЛЕНИН

ПЕЧАТЬ ...САМОЕ ОСТРОЕ И САМОЕ СИЛЬНОЕ ОРУДИЕ НАШЕЙ ПАРТИИ.

СТАЛИН

ДЕНЬ ПЕЧАТИ

Газета «Уперад» (5 мая 1944 г.) Дзень друку.

У пятніцу, 20 чэрвеня 1941 года, выйшаў апошні перадваенны нумар газеты з перадавым артыкулам «Мацаваць абаронную работу». На жаль, мацаваць было позна. У першыя дні вайны нямецкія самалёты ўжо бамбілі наш горад, а праз некаторы час наогул акупіравалі яго. Газета прыпыніла свой выхад. Яна і насельніцтва прыціхлі пад цяжарам навалы.

1 чэрвеня 1943 года газету абудзіў партызанскі рух. Свая, знаёмая газета «Уперад» пачала выходзіць на лістках з вучнёўскага сшытка, на абгортачнай паперы. Друкаваная вестка палящела да мясцовых чытачоў аб поспехах савецкіх войск на франтах, подзвігах партызан, аб мацнеючых сувязях паміж імі і насельніцтвам, пра абарону мірных жыхароў ад рабавання і згону ў фашысцкую няволю. Газета стала падпольнай. Яшчэ гучней яна заяўляла на сваіх старонках: «Біце ворага! Знішчайце фашысцкае логава!»

Захопнікі прыраўноўвалі моц друкаванага слова да выбуху авіяцыйнай бомбы. Гітлераўцы абяцалі вялікую ўзнагароду за раскрыццё месца дыслакацыі партызанскай друкарні. У той час на працягу двух месяцаў рэдактарам быў партызан атрада імя А. Неўскага, даваенны журналіст Герасім Коган, а пасля яго гібелі быў прызначаны даваенны педагог, партызан атрада імя Чкалава Юльян Драгун. Менавіта ён у 1959 годзе перадаў у лідскі краязнаўчы музей адзін з першых нумароў газеты «Уперад» ад 1 ліпеня 1943 года. У той час музей толькі адкрыўся, і гэты, і яшчэ чатыры нумары газеты-партызанкі, лістоўкі за 1944 год сталі кропкай адліку экспанатаў фонду гісторыка-мастацкага музея.

Спачатку газета выпускалася на базе Баранавіцкага падпольнага абкама партыі, потым каля вёскі Поташня ў Налібоцкай пушчы, дзе размяшчаўся Лідскі міжрайпартцэнтр. Там была створана свая друкарня. Дарэчы, ёй карысталіся таксама падпольныя органы Юрацішкаўскага, Іўеўскага, Любчанскага і Навагрудскага райкамаў КПБ. Набіралася, друкавалася і тыражавалася газета ўручную ў партызанскіх зямлянках. Фармат — стандартны ліст пісчай паперы, сшыткавыя лісты ў клетку і касую лінейку, абгортачная папера. Актыўнай была дапамога падпольшчыкаў. Па сведчанні кіраўніка міжрайпартцэнтра Яфіма Гапеева, праз лідскага падпольшчыка Сароку, яго дачку Ганну і сына Мікалая партызаны атрымлівалі з Ліды паперу, фарбу і нават шрыфты. Дапамагалі і мінскія таварышы.

Адзін цікавы факт, які захаваўся з успамінаў былога сакратара Навагрудскага райкама камсамола Рыгора Фамічова, які пазней узначальваў Лідскую гарадскую партарганізацыю, а потым быў старшынёй Гродзенскага аблвыканкама. Вось што ён узгадваў:

*«Аднойчы цэлую ноч мы прасядзелі з рэдактарам газеты «Уперад» Юльянам Драгуном над тэкстам звароту да моладзі Навагрудскага раёна. Той жа ноччу зварот надрукавалі ў падпольнай друкарні, а раніцай сувязныя аднеслі ў Навагрудак і расклеілі па горадзе. Наша мэта заключалася ў тым, каб не дапусціць угону моладзі ў нямецкае рабства, каб юнакі і дзяўчаты папаўнялі шэрагі партызан».*

Да 8 ліпеня — дня вызвалення Ліды — было выпушчана 52 нумары газеты агульным тыражом 26 тысяч экземпляраў. Летам 1944 года ў Прынёманне прыйшло доўгачаканае вызваленне. І на змену пушчанскай «партызанцы» ў Лідзе пачала выходзіць легальная газета «Уперад» на дзвюх палосах. Да канца вайны ў ёй галоўным чынам друкаваліся загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, аператыўныя зводкі з франтоў. Рэдагаваў газету Юльян Драгун. Час быў нялёгкі: ішло аднаўленне разбуранай гаспадаркі, адкрываліся школы і хаты-чытальні, разгортвалася калектывізацыя, у раёне праліваласа кроў — дзейнічалі тыя, хто выступаў супраць улады Саветаў.

Гарадскія прадпрыемствы паступова пачалі адбудоўвацца. Адрадзіўся камбінат харчовых канцэнтратаў, завод сельскагаспадарчага машынабудавання, мясакамбінат, млынзавод. Жыццём горада жыла і газета. Раёнка некалькі разоў мяняла назву: у 1962 годзе «Уперад» была перайменавана ў «Сцяг Працы», у 1966 годзе вярнулася яе назва — «Уперад», а напрыканцы 1991 года выданне атрымала назву «Лідская газета». Мяняліся і рэдактары газеты. 30 верасня 2014 года «Лідская газета» адзначыла сваё 75-годдзе.

* * *

У літаратурным аддзеле Лідскага гісторыка-мастацкага музея да 70-годдзя Вялікай Перамогі ў выставачным пакоі «Вайны свяшчэнныя старонкі» праходзіць агляд калекцыі друкаваных выданняў часоў Вялікай Айчыннай вайны пад назвай «І слова клікала ў бой...». Газеты «Уперад», «Чырвоная Звязда», улёткі, якія калісьці былі перададзены яшчэ пры жыцці Юльянам Драгуном, а таксама Аляксандрам Жалкоўскім (а пасля смерці — жонкай Валянцінай Іосіфаўнай), і сталі асноўай экспазіцыі. Частка нямецкіх выданняў («Беларуская газета», «За праўду», «За Родину», «Baranavickaja Hazeta» і інш.) была перададзена ў фонд музея і Нонай Якаўлевай — дачкой камандзіра лідскага партызанскага злучэння Яфіма Гапеева. У тым, што ў Жалкоўскага захоўвалася запаветная папка з газетамі ад Драгуна, адночы прызнаўся ён сам на старонках лідскай раёнкі: *«...Запомнілася мне апошняя гутарка з колішнім рэдактарам. У пачатку 1970-х гадоў у маім кабінеце ў газеце «Уперад» раздаўся міжгародні званок: тэлефанаваў Юльян Баляслававіч. Ён прапанаваў мне са свайго архіва папку падпольных газет і лістовак, што выдаваліся ў Лідскім партызанскім злучэнні. Па дамоўленасці ветэран вайны і працы (ён быў пенсіянерам) занёс тую папку ў рэдакцыю абласной газеты, дзе пазней і атрымаў я неацэнны дарунак. Пазней у ролі дарыцеля давялося быць мне: газеты і лістоўкі спрэзентаваў музеям Гродна і Мінска, Ліды, Навагрудка і Карэліч, Іўеўскім краязнаўцам. Хай захаваецца творчасць партызанскіх журналістаў і друкароў для нашчадкаў.*

*Частка друкаванай прадукцыі захоўваецца ў запаветнай папцы. Калі адкрываю яе, з захапленнем учытваюся ў хроніку гадоў, што адышлі ў гісторыю. З пажоўклых старонак паўстаюць баявыя аперацыі партызан, іх мірная акцыя па дапамозе сялянам правесці веснавую сяўбу 1944 года, хвалюючыя дні вызвалення Лідчыны, аднаўленчыя работы ў горадзе і раёне...».*


**ЖАЛКОЎСКІ Аляксандр Васільевіч — галоўны рэдактар газеты «Уперад» (1969-1989).**


**Раздача газеты «Уперад» у Лідзе ў 1939 годзе (вугал вул. Сувальскай (Савецкай) і 3 Мая (Ленінскай).**

**Алесь ХІТРУН,**
**навуковы супрацоўнік літаратурнага аддзела Лідскага гісторыка-мастацкага музея.**

***(Аўтар выказвае ўдзячнасць часопісу «Лідскі летапісец», старшаму навуковаму супрацоўніку музея Валерыю СЛІЎКІНУ, жонцы рэдактара газеты «Уперад» Валянціне ЖАЛКОЎСКАЙ, лідскаму пісьменніку Уладзіміру ВАСЬКО за выкарыстаныя да публікацыі матэрыялы.)***

# ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ З НОВЫМ ПАДТЭКСТАМ,

## або Чаму школьныя адзнакі не заўсёды пацвярджаюцца незалежным ацэньваннем?

**Ці з'яўляецца якасць адукацыі для сталічнай сістэмы адукацыі самай вострай праблемай? Калі абапірацца на традыцыйныя індыкатары (колькасць пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, вынікі ЦТ, конкурс у гімназіі і г.д.), то хвалявацца кіраўнікам галіны быццам бы не выпадае. Але ёсць і іншы бок медаля. І пра гэта ішла гаворка падчас жнівеньскага форуму педагагічных работнікаў сталіцы, які вызначае кірунак развіцця сістэмы адукацыі на бліжэйшы навучальны год.**

На цяперашні момант у Мінску дзейнічаюць 49 гімназій і 2 агульнаадукацыйныя ліцэі. **Старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК** агучыў наступныя лічбы. Конкурс сярод ахвотных стаць гімназістам склаў у сярэднім па горадзе 1,4 чалавека на месца. Самы высокі конкурс быў зафіксаваны ў славутай 41-й гімназіі. Сярэдні бал тых, хто паступаў, склаў 50,4. У 34-х гімназіях прахадны бал аказаўся вышэйшым за сярэдні па горадзе. У гімназіях з беларускай мовай навучання сярэдні бал перавысіў 40.

Амаль палова тых, хто здаваў экзамены ў гімназію, атрымалі па рускай і беларускай мовах 10 балаў. Па матэматыцы на «дзясятку» здалі экзамен больш як трацінa. Сярэдні конкурс у сталічных ліцэі склаў 1,7 прэтэндэнта на месца.

### РУХ НАПЕРАД ЦІ АДКАТ НАЗАД?

Сярод вучняў 11-х класаў школ на экзамене па замежнай мове адзнакі ад 7 да 10 балаў атрымалі 74,5% ад агульнай колькасці выпускнікоў.

— Выдатная лічба. Зыходзячы з таго, што ў аснову вывучэння замежнай мовы зараз пакладзены камунікатыўна-арыентаваны падыход, атрымліваецца, што тры чвэрці нашых выпускнікоў павінны дастаткова свабодна валодаць замежнай мовай і спакойна на ёй размаўляць. Але ж мы ўсе ведаем, што гэта не так, — падкрэсліў Міхаіл Міронччык.

**У сярэднім кожны другі вучань не задае настаўніку пытанняў, калі штосьці не зразумее ў ходзе тлумачэння на ўроку. Такая ж колькасць не выконвае ўсіх заданняў, прапанавых настаўнікам. Кожны пяты (21,7%) няўважліва слухае настаўніка.**

Ад 7 да 10 балаў па беларускай мове атрымалі 68,3% выпускнікоў, па рускай мове — 52%, матэматыцы — 40% .

Па выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання 15 сталічных устаноў адукацыі ўвайшлі у ТОП-100. Трыццаць працэнтаў стабальнікаў на ЦТ з'яўляюцца прадстаўнікамі сталіцы. Па сярэднім бале мінскія навучэнцы лідзіруюць на ЦТ па сямі дысцыплінах: гэта матэматыка, нямецкая і кітайская мовы, хімія, біялогія, геаграфія, гісторыя. Па выніках заключнага тура рэспубліканскіх прадметных алімпіяд мінскія вучні ўжо ў 16-ты раз захавалі за сабой першае агульнакамандное месца. Прадстаўнікі сталічных устаноў адукацыі заваявалі 114 дыпломаў і 17 пахвальных водгукаў. Упершыню за апошнія тры гады назіраўся рост колькасці дыпломаў. Атрымалася павялічыць адрыў ад найбліжэйшых сапернікаў. Калі ў 2014 годзе ён склаў усяго 4 дыпломы, то сёлета — 25. Найбольшую колькасць дыпломаў на заключным туры заваявалі вучні гімназій №№ 41, 29, 1, 13, 24, 38 і сярэдняй школы № 73.



Фота Надзеі БУЖАН.

Вучыцца — заўсёды гатовы! 32-я сталічная школа прыняла першых вучняў.

Істотны рывок з апошняга на першае месца ў рэспубліканскім рэйтынгу адбыўся па гісторыі і біялогіі. Затое было страчана лідарства па грамадазнаўстве, англійскай і французскай мовах.

— Ці задаволены мы гэтым вынікам? Нельга даць адназначнага адказу, бо, на жаль, акрамя руху па некаторых прадметах наперад, ёсць і адкат назад, — канстатаваў Міхаіл Міронччык. — У нас апошняя пазіцыя ў рэспубліканскім рэйтынгу па інфарматыцы, перадапошняя пазіцыя — па рускай мове. Вось ужо на працягу трох гадоў зніжаецца выніковасць выступлення на алімпіядзе каманды па фізіцы. Упэўнены, што сталічныя педагогі валодаюць дастатковым патэнцыялам для пераадолення гэтай сітуацыі...

### ДЗЕ «КУЮЦЦА» ПЕРАМОГІ?

Добра выступілі мінскія школьнікі гэтым летам і на міжнародных алімпіядах — у іх 18 узнагарод рознай вартасці. «Перамогі — гэта выдатна, але галоўнае, каб кожнае таленавітае дзіця было заўважана педагогам, і не проста заўважана, а каб з ім вялася сістэмная праца», — заўважыў Міхаіл Міронччык.

Старшыня камітэта па адукацыі лічыць, што задача заўтрашняга дня — улічваць пры ацэньванні якасці адукацыі не толькі ўсе вышэйпералічаныя крытэрыі, але і тыя, якія непасрэдна ўплываюць на грамадства, эканоміку і рынак працы. Гэта будуць прынцыпова новыя крытэрыі, і якасць навучання будзе наўпрост звязваецца з яго эфектыўнасцю. Ацэньваць якасць адукацыі з такой пазіцыі яшчэ трэба навучыцца.

Напрыклад, 27% з агульнай колькасці ўсіх пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды складаюць навучэнцы трох сталічных гімназій — 41-й, 20-й і 1-й. Гэтыя ж установы далі 57% пераможцаў міжнародных алімпіяд. І толькі 53% школ, якія маюць класы з павышаным узроўнем вывучэння прадметаў, паказалі годныя вынікі на трэцім этапе рэспубліканскіх прадметных алімпіяд.

У сталіцы працуюць пяць гімназій з беларускай мовай навучання з самадастатковымі сістэмамі выхавання.

— Разумеючы аб'ектыўныя складанасці пры іх камплектаванні, горад даўно закрывае вочы на становішча беларускамоўных гімназій у агульным рэйтынгу, але, напэўна, ужо прыйшоў час сказаць, што мы чакаем ад іх пэўных вынікаў. Я маю на ўвазе ўдзел у алімпіядах, — патлумачыў Міхаіл Міронччык. — Каму, як не прадстаўнікам гэтых устаноў, займаць прызавыя месцы на алімпіядзе па беларускай мове? Бо менавіта там навучаюцца высокаматываваныя да вывучэння роднай мовы дзеці. А па факце ў трох гімназіях з пяці вынікаў няма.

### МАНІТОРЫНГ — ПАДСТАВА ДЛЯ РОЗДУМУ

Сёлета выпускнікі 11-х класаў упершыню здавалі экзамен па гісторыі Беларусі. Яшчэ зусім нядаўна педагогі канстатавалі, што пры вывучэнні гісторыі ў навучэнцаў узнікаюць пэўныя цяжкасці пры абагульненні інфармацыі, выяўленні прычынна-выніковых сувязяў, аналізе гістарычных дакументаў. А на выпускным экзамене па гісторыі Беларусі адзнакі ад 7 да 10 балаў атрымалі 68,7% вучняў — дзве трэці.

Але ёсць і іншая інфармацыя для больш глыбокага аналізу якасці адукацыйнага працэсу — гэта вынікі рэспубліканскага маніторынгу ўзроўню навучанасці школьнікаў, які праводзіць Нацыянальны інстытут адукацыі. Удзел у ім прымалі і мінскія школьнікі.

— Скажу прама — тут ёсць над чым працаваць, — заявіў на форуме старшыня камітэта па адукацыі.

—- Фарміраванне чытацкай падрыхтаванасці з'яўляецца галоўнай кампетэнцыяй для паспяховага авалодання асновамі ўсіх навук. Па выніках маніторынгу, з заданнямі, якія вымагаюць простага ўмення знайсці інфармацыю, справіліся 80% пяцікласнікаў і 65% васьмікласнікаў. З заданнямі, якія патрабуюць умення інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, аналізаваць і ацэньваць змест — адпаведна 40% і 29%. Вынікі гавораць самі за сябе, і нам ёсць над чым сур'ёзна задумацца.

З заданнямі кантрольнай работы па матэматыцы, якія адпавядаюць першаму ўзроўню складанасці, справіліся ў сярэднім 76% вучняў пятых класаў, з заданнямі другога ўзроўню — 78%, трэцяга — 16%, чацвёртага — 3% і пятага — 1%. Тэкставую задачу на дробы правільна рашылі толькі 4,7% дзяцей. Па словах Міхаіла Міронччыка, калі суаднесці гэтыя вынікі з вынікамі ўступных экзаменаў у гімназіі, то высноўа напрошваецца толькі адна: «Мы «нашпігоўваем» нашых дзяцей на вынікі. Не працуем над фарміраваннем ключавых кампетэнцый, хоць і вызначаем гэты напрамак як адзін з прыярытэтных».

Увагі заслугоўваюць і вынікі маніторынгу па сусветнай гісторыі, які праводзіўся сярод шасцікласнікаў. З вучняў, якія атрымалі за 2013/2014 навучальны год па гэтым прадмеце адзнакі 9 і 10 балаў, толькі 35% правільна выканалі заданні другога і трэцяга ўзроўняў складанасці, 5,4% справіліся з заданнямі чацвёртага і 6,8% — з заданнямі пятага ўзроўню складанасці. На думку кіраўніка камітэта па адукацыі, гэта дастаткова ярка характарызуе ўменне або няўменне педагогаў правільна арганізоўваць дзейнасць вучняў і метадычна спланаваць урок.




Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Іван АРЭХАЎ, вучань 4 «В» класа гімназіі №20, прадэманстраваў удзельнікам педагагічнага форуму сваю праектна-доследную работу «Выкарыстанне прыбора для дэзынфекцыі і абеззаражвання зубных шчотак у хатніх умовах».

А калі яшчэ і паглядзець на вынікі анкетавання саміх навучэнцаў, то карцінка атрымліваецца зусім сумная. У сярэднім кожны другі вучань не задае настаўніку пытанняў, калі штосьці не зразумее ў ходзе тлумачэння на ўроку. Такая ж колькасць не выконвае ўсіх заданняў, прапанаваных настаўнікам. Кожны пяты (21,7%) няўважліва слухае настаўніка.

— Гэта выразна характарызуе ўзровень узаемадзеяння педагогаў з вучнямі, — упэўнены Міхаіл Міронччык. — Яшчэ і яшчэ раз пераконваемся, што якасць адукацыі — паняцце адноснае. Галоўнае, каб веды сталі добрым стартавым капіталам для выпускнікоў і дапамагалі ім упэўнена рухацца ў самастойнае жыццё.

### НЕАПТЫМАЛЬНАЯ ПРАПОРЦЫЯ

З 2015/2016 навучальнага года на старшай ступені школы ўводзіцца профільнае навучанне. Па словах старшыні камітэта, горад да гэтага гатовы, але і фарсіраваць адкрыццё профільных класаў паўсюдна, у кожнай установе, у сталіцы не збіраюцца, як бы ні хацелася вярнуцца да маштабных паказчыкаў ахопу дыферэнцаваным навучаннем узору 2008 года.

Міхаіл Міронччык патлумачыў, што пры адкрыцці профільных класаў горад будзе арыентавацца не толькі на запатрабаванні вучняў і бацькоў. Ёсць яшчэ і патрэбы горада ў прадстаўніках розных прафесій, пэўная сітуацыя на рынку працы... Таму трэба больш актыўна ўплываць на фарміраванне профіляў і адукацыйнага заказу. У прыватнасці, менавіта гэтым прынцыпам у сталіцы кіраваліся пры адкрыцці педагагічных класаў.

У бягучым навучальным годзе ва ўстановах адукацыі створаны 394 дзясятыя класы: з іх 189 базавых і 205 — профільных, у тым ліку 8 класаў профільнай скіраванасці (5 педагагічных, 2 прававі і ваенна-патрыятычны). Найбольш запатрабаваным спалучэннем дысцыплін, якія будуць вывучацца на павышаным узроўні, сталі руская і замежная мовы (66 філалагічных класаў), фізіка і матэматыка (65 класаў), хімія і біялогія (16 класаў). У камітэце па адукацыі не лічаць такую прапорцыю аптымальнай і не выключаюць, што ў перспектыве яна будзе карэктавацца.

### ВУЧНІ Ў СЕЦІВЕ

І яшчэ на адзін важны аспект звярнуў увагу педагогаў Міхаіл Міронччык.

— Нярэдка наша выхаваўчае ўздзеянне ідзе ўслед за падзеямі, а не апярэджвае іх. Напрыклад, нашы дзеці даўно «жывуць» у інтэрнэце. Ім там прапануюць спайсы, вярбуюць у розныя дэструктыўныя арганізацыі, глыбока ўздзейнічаюць на дзіцячую псіхіку. Нават клуб суіцыднікаў там ёсць! І гэта толькі тое, што знаходзіцца на паверхні. На жаль, ні мы, педагогі, ні бацькі нічога пра гэта не ведаем. А часта спахопліваемся, толькі калі прыходзіць бяда: калі нашы дзеці выходзяць з акна, трапляюць у медыцынскія ўстановы пасля ўжывання спайсаў, уцякаюць з дому... У такіх сітуацыях уздзейнічаць на моладзь вельмі складана, а часам і немагчыма. Таму дзейнічаць трэба на апярэджанне, а для гэтага неабходна шырока абазначыць сябе ў сацыяльных сетках і весці там адкрыты дыялог з моладдзю. Мы ўжо некалькі гадоў пра гэта размаўляем, а кола педагогаў і кіраўнікоў, адкрытых для нефармальных зносін у сеціве, застаецца вельмі вузкім. І мы па-ранейшаму далёкія ад сваіх вучняў, — канстатаваў старшыня Камітэта па адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

# АДКЛАД НЕ ІДЗЕ НА ЛАД

## Адтэрміноўка выплат не пазбаўляе ад даўгоў

**Украіне ўдалося дамовіцца з прыватнымі крэдыторамі пра рэструктурызацыю доўгу. Для Кіева гэта грандыёзны поспех, які дазволіць атрымаць новыя траншы ад МВФ, а значыць — пазбегнуць фінансавага краху. У той жа час пытанне пра тое, ці не з'яўляецца дамоўленасць проста адкладваннем праблемы «на потым», без яе прынцыповага вырашэння, застаецца адкрытым.**




### ПАЗБЕГНУЦЬ ДЭФОЛТУ

Спачатку, так бы мовіць, знешняя абалонка гучнай падзеі. Крэдыторы на чале з амерыканскім фондам Franklin Templeton спісваюць Кіеву 20% асноўнага доўгу па еўрааблігацыях на $19,3 млрд, то бок $3,8 млрд, перадае украінскае выданне «Новы час». Лічба ўключае еўрааблігацыі горада Кіева і асобныя знешнія абавязкі дзяржкампаній, якія Украіна разлічвае разглядаць на тых жа ўмовах (без гэтага спісання складуць да $3,6 млрд), удакладняецца ў прэс-рэлізе ўкраінскага Мінфіна. «Гаворка ідзе пра тое, што ўрад Украіны спісаў амаль $4 млрд», — сцвярджае прэм'ер-міністр Украіны Арсеній Яцанюк. Тэрміны пагашэння па астатняй суме ў $15,5 млрд пераносяцца на чатыры гады — на 2019—2027 гг. (замест цяперашніх 2015—2023 гг.).

«Гэта былі вельмі цяжкія пяць месяцаў. Упэўнена, што рынкі добра ўспрымуць вынік перамоў», — цытуе міністра фінансаў Украіны Наталлю Ярэську агенцтва Bloomberg. Па яе словах, гэта здзелка, у якой выйграюць абодва бакі (хоць раней Украіна настойвала на спісанні 40% доўгу).

Рэструктурызацыя дазволіць Украіне пазбегнуць дэфолту па еўрабондах на $500 млн, тэрмін пагашэння якіх настаўаў у верасні. «Чаканы нашымі ворагамі дэфолт не адбудзецца», — такімі словамі адкрыў прэм'ер-міністр Арсеній Яцанюк пазачарговае пасяджэнне ўрада. Ён паведаміў, што ў наступныя чатыры гады Украіна не будзе гасіць «цела» абавязку, а выплаты па купонах, запланаваныя да канца 2015 года, будуць адкладзены. Частка сэканомленых на рэструктурызацыі грошай урад хоча накіраваць на «павышэнне сацыяльных стандартаў».

### ТОЕ, ШТО ДОКТАР ПРАПІСАЎ

Яшчэ пару месяцаў назад крэдыторы і чуць не хацелі ні пра якое спісанне — максімум былі гатовы перасунуць тэрміны выплат. Тут Наталлі Ярэсьцы шмат у чым дапамог вопыт працы ў прыватным фінансавым сектары ЗША, дзе ёй давялося пераконваць інвестараў набываць украінскія актывы, пры тым што многія з іх нават не ведалі, дзе Украіна знаходзіцца, адзначае Lenta.ru. Так ці інакш, але ў яе атрымалася спачатку ўгаварыць гендырэктара Franklin Templeton Майкла Хейзенстэба пагадзіцца на спісанне 5% доўгу, а потым і павялічыць гэтую лічбу да 20%.

Зрэшты, звышвыгадным пагадненне выглядае толькі на першы пагляд. Адной з саступак, на якія давялося пайсці інвестарам, стала павышэнне стаўкі па аблігацыях да 7,75 працэнта гадавых, што на палову працэнтнага пункта вышэй, чым на былых умовах. Так што з сумы зніжкі давядзецца адняць некалькі сотняў мільёнаў долараў. Ёсць і яшчэ адна цікавая кандыцыя: Украіна з 2019 года будзе абавязана плаціць у кошт пагашэння доўгу 40 працэнтаў ад аб'ёмаў росту валавога ўнутранага прадукту, калі паказчык перавышае 4%. Значыць, калі да таго часу ВУП краіны дасягне 100 мільярдаў долараў і павялічыцца цягам года на 5 працэнтаў, Кіеў аўтаматычна пералічвае інвестарам $1 млрд.

Вядома, у гэтым пагадненні ёсць элемент таго, што ў ЗША называюць kicking the can down the road (даслоўна «штурхаць бляшанку ўніз па дарозе» ці ў агульнай форме зноў-такі «штурхаць» ад сябе праблему «на пасля»). Праблемы ў цэлым захоўваюцца, а іх рашэнне проста пераносіцца да лепшых часоў. З-за абвалу грыўні намінальны ВУП апусціўся больш чым удвая — да 70 мільярдаў долараў. Прыкладна столькі ж цяпер складае сумарны дзярждоўг краіны. У параўнанні з гэтымі лічбамі 4-мільярднае спісанне доўгу — гэта, па вялікім рахунку, «капейкі», якія нічога прынцыпова не змяняюць.

Пры гэтым, вядома, трэба ўлічваць той факт, што ніякага іншага задання перад кіеўскімі ўладамі і не стаяла. Дэфолт варыянтам не быў, бо прывёў бы да катастрафічнага адтоку капіталу і проста знішчыў бы грыўню. Разлічваць на сур'ёзную палёгку пазыковага цяжару таксама не даводзіцца. Але адклад і спісанне — гэта якраз тое, што доктар у выглядзе МВФ прапісаў.

Цяпер фонд згодны пералічыць далейшыя траншы. Дырэктар-распарадчыца Крысцін Лагард заявіла, што пагадненне забяспечвае фінансавую ўстойлівасць Украіны, а значыць, сродкі арганізацыі могуць быць адпраўлены Кіеву, які востра мае патрэбу ў валюце для папаўнення сваіх міжнародных рэзерваў.

**Аргенціна ў свой час актыўна праводзіла ліберальныя рэформы, змяншала гандлёвыя бар'еры, актыўна супрацоўнічала з МВФ. Яе аблігацыі таксама актыўна скупляў Franklin Templeton, які, дарэчы, сёння з'яўляецца найбуйнейшым трымальнікам украінскіх аблігацый. У выніку ў снежні 2001 года МВФ «раптам» рэзка перадумаў дапамагаць і не прадаставіў чарговых траншаў дапамогі. Як вынік — дэфолт і рэзкае падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва.**

### ДАЙ $3 МЛРД

Зрэшты, мэтавая сума спісанняў — $3,8 млрд — насамрэч можа аказацца меншай. На рэструктурызацыю пакуль пагадзіўся толькі камітэт крэдытораў, што складаецца з фондаў Franklin Templeton, T Rowe Price, BTG Pactual і TCW, — яны трымаюць $8,9 млрд украінскага абавязку. Трымальнікі астатніх звыш $10 млрд змогуць прагаласаваць па ўмовах рэструктурызацыі ў сярэдзіне верасня, калі запланавана публікацыя праспекта новых папер. Галасаванне будзе па кожным пэўным выпуску.

Украіна працягне гасіць купоны (на агульную суму прыкладна ў паўмільярда долараў да канца года), а вось выплаты па еўрааблігацыях (на $500млн і €600 млн), якія прыпадалі на верасень і кастрычнік, будуць перанесены. Па-ранейшаму застаецца незразумелым, што будзе з трохмільярдным абавязкам перад Расіяй, ад рашэння па якім шмат у чым залежыць лёс Украіны як даўжніка.

Як вядома, у 2013 годзе, калі Масква пералічыла Кіеву гэтую суму, чакалася, што гэта толькі першы з траншаў ад маштабнага пакета дапамогі ў 15 мільярдаў долараў. Потым здарыліся вядомыя падзеі, і праграма была замарожана. «Тым часам неўпрыкмет падышоў і тэрмін выплат...

«Ва Украіны ёсць тры варыянты ўрэгулявання абавязку перад Расіяй: выплаціць яго, правесці рэструктурызацыю запазычанасці ці пайсці па шляху дэфолту», — піша Наташа Доф з дзелавога агенцтва Bloomberg. Пазіцыя Украіны агучвалася не раз: улады ў Кіеве лічаць, што Масква павінна пагадзіцца на тыя ж умовы, якія абгаворваліся з прыватнымі крэдыторамі, — спісанне адной пятой пазыкі і перанос тэрмінаў. У Расіі ўвесь апошні год прапановы падобнага роду адпрэчвалі катэгарычна. Пазіцыя Украіны грунтуецца на тым, што, строга кажучы, Расія не прадастаўляла міждзяржаўнага крэдыту, а закупіла аблігацыі на патрэбную суму на рынку. Адпаведна, да Масквы прымяняльныя тыя ж умовы, што і да іншых інвестараў па ўкраінскі доўг.

З іншага боку, у Маскве ўпэўнены, што фінансаванне дзяржавы дзяржавай застаецца такім незалежна ад схемы крэдытавання. Але нават калі дапусціць, што ўкладанні ва Украіну з'яўляюцца па форме прыватнай інвестыцыяй, у «пуле» фундатараў, з якім Кіеў вёў перамовы, Міністэрства фінансаў РФ не значыцца.

Нагадаем: размяшчэнне ўкраінскіх еўрабондаў, набытых Расіяй, праводзілася на Ірландскай фондавай біржы па англійскім праве. Пры гэтым у праспекце эмісіі замацаваны важныя дэталі. Па-першае, расійскі бок можа разлічваць на прыярытэт у пагашэнні пазыкі пры рэструктурызацыі, па-другое — на датэрміновае пагашэнне абавязку, калі дзярждоўг Украіны перавысіць 60% ВУП. З фармальнага пункту гледжання, пазіцыі Расіі ў спрэчцы з Украінай вельмі пераканаўчыя. І калі Кіеў адмовіцца плаціць, Масква сапраўды зможа абараніць свае інтарэсы ў судовым парадку.

### АРГЕНЦІНСКІ ВАРЫЯНТ

Нягледзячы на дасягнутыя дамоўленасці, украінскі дэфолт не толькі працягвае маячыць на гарызонце, але і паступова набліжаецца. Так, прынамсі, лічаць у крэдытным агенцтве Fitch, якое пасля дасягнення пагаднення паміж Кіевам і крэдыторамі яшчэ раз панізіла доўгатэрміновы крэдытны рэйтынг Украіны, з узроўню СС да С (практычна няўхільны дэфолт).

Каб не складвалася ўражання пра аднабокія ацэнкі, прывядзём меркаванне іншых экспертаў. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standard & Poor's (S&P) пацвердзіла доўгатэрміновы крэдытны рэйтынг Украіны на ўзроўні СС — прагноз негатыўны. Гэты рэйтынг знаходзіцца літаральна за крок ад рэйтынгу D, які будзе азначаць дэфолт. Пацверджаны і доўгатэрміновыя суверэнныя крэдытныя рэйтынгі на ўзроўні ССС +, таксама з негатыўным прагнозам. «На наш погляд, дэфолт па доўгу ўрада Украіны ў замежнай валюце з'яўляецца практычна няўхільным», — адзначаюць у агенцтве. На думку экспертаў S&P, валавы ўнутраны прадукт Украіны сёлета скароціцца прыкладна на 15%.

Зніжэнню рэйтынгу здзіўляцца не варта. Сам па сабе факт рэструктурызацыі — гэта юрыдычнае афармленне няздольнасці даўжніка своечасова заплаціць па сваіх абавязках, як адзначае незалежны аналітык Дзмітрый Адамідаў. Эксперт падкрэслівае, што пры несумненным лакальным поспеху агульнай сумнай карціны гэта не змяняе. І тут справа нават не ў аб'ёме астатняга доўгу, а ў агульным стане эканомікі краіны. Таму гісторыя з украінскімі пазыкамі, хутчэй за ўсё, будзе развівацца па тыповым лацінаамерыканскім сцэнарыі, як адзначае expert.ru.

У прыватнасці, у вельмі падобнай сітуацыі напачатку 2000-х гадоў аказалася Аргенціна. Яна актыўна праводзіла ліберальныя рэформы, змяншала гандлёвыя бар'еры, актыўна супрацоўнічала з МВФ. Яе аблігацыі таксама актыўна скупляў Franklin Templeton, які, дарэчы, сёння з'яўляецца найбуйнейшым трымальнікам украінскіх аблігацый. У выніку ў снежні 2001 года МВФ «раптам» рэзка перадумаў дапамагаць і не прадаставіў чарговых траншаў дапамогі. Як вынік — дэфолт і рэзкае падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва. Сітуацыя ва Украіне сёння развіваецца, быццам пад капірку...

### ГУЛЬНЯ Ў ЛІЧБЫ

Як паведамлялі інфармагенцтвы, пасля з'яўлення навіны пра спісанне даўгоў украінскія аблігацыі пачалі даражэць, а паперы з пагашэннем у ліпені 2017 года паказалі рэкордны рост. Так, еўрабонды Украіны з тэрмінам абарачэння да ліпеня 2017-га выраслі ў кошце на рэкордныя 8,9 цэнта — да 64,5 цэнта за 1 долар наміналу. Дзяржаблігацыі з пагашэннем у красавіку 2023-га павялічыліся на 5,7 цэнта — да 60,14 цэнта за 1 долар наміналу.

«Гэта азначае, што нават тыя нешматлікія інвестары, якія ўсё яшчэ спрабавалі купляць/прадаваць украінскія еўраоблігацыі, цяпер іх скідаюць», — растлумачыў Аляксандр Ахрыменка з Украінскага аналітычнага цэнтра. А ўлады, замест таго, каб заняцца эканомікай краіны, заняты гульнямі, лічыць спецыяліст. Аналітык у якасці прыкладу прыводзіць супярэчлівыя паведамленні: «То ўлады заяўляюць, што дэфіцыт дзяржбюджэту не дазваляе ім цяпер падняць заработную плату і пенсіі, а то выхваляюцца, што дзякуючы іх рэформам дзяржбюджэт стаў прафіцытным».

Аляксандр Ахрыменка тлумачыць, у чым жа складаецца парадокс украінскага дзяржбюджэту: «Паводле афіцыйных звестак за першае паўгоддзе 2015 года дзяржаўны бюджэт Украіны мае дэфіцыт 2,1 мільярда грыўняў, а вось зборны бюджэт Украіны, які яднае дзяржаўныя і мясцовыя бюджэты, мае прафіцыт больш за 12 мільярдаў грыўняў. Гэта дзіўна, калі не сказаць больш».

Эканаміст сцвярджае, што сёлета ўрад Яцанюка за кошт махінацый з новымі падаткамі і дэвальвацыі забрала ва ўкраінцаў у дзяржбюджэт на 33% больш, чым летась. Улады краіны, падкрэслівае аналітык, не жадаюць дапамагчы народу Украіны. «Яны добра разумеюць, што ўсе гэтыя прафіцыты зборнага дзяржбюджэту і пахвальба наконт росту збіральнасці падаткаў выглядаюць абсурдна. Усё гэта больш гульня ў лічбы, чым рэальная эканоміка», — упэўнены Ахрыменка.

Украіна рухаецца да самага глыбокага эканамічнага крызісу за ўсю сваю сучасную гісторыю. Такую думку ў эфіры тэлеканала «112 Украіна» выказаў колішні прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. «Калі вы не вырашылі пытанне стабільнасці грошай і цэн, дапусціце фінансавую дэстабілізацыю, калі вы страцілі кантроль над цэнамі і над курсам, то вы вядзём украінскую эканоміку да самага глыбокага эканамічнага краху за 24 гады», — заявіў Віктар Юшчанка.

Дарэчы, гэта добра разумее большасць насельніцтва. Каля 70% жыхароў Украіны падчас апытання заявілі пра незадаволенасць сваім жыццём, адзначыўшы, што падзеі ў краіне развіваюцца «не ў тым кірунку».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ**
*litvinov@zviazda.by*



■ Любіць Беларусь!

# ПАЧУЦЦІ ДА РАДЗІМЫ — ЯК ПЕСНЯ

## У жыхароў розных куткоў краіны ёсць магчымасць перажыць іх разам з ансамблем народнай музыкі «Бяседа»

**Канцэртнай праграмай у Гродзенскім каледжы мастацтваў стартавала маштабная акцыя «Любіць Беларусь!». Тэлеканал «Беларусь 3» Белтэлерадыёкампаніі наладзіў яе сумесна з рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» і ансамблем народнай музыкі «Бяседа» пры падтрымцы Выдавецкага дома «Звязда». Творчае падарожжа вядомага калектыву пройдзе па ўсіх абласных і дванаццаці раённых цэнтрах краіны, а завершыцца 10 кастрычніка фінальным гала-канцэртам у Мінску.**



**НАША ДАВЕДКА**

*Ансамбль народнай музыкі «Бяседа» створаны ў 1991 годзе. «Бяседа» азначае, што сваякі, сябры збіраюцца разам, каб пагутарыць і паспяваць: «Пайшлі на бяседу», «Сядзім на бяседзе»... Канцэртныя праграмы ансамбля — быццам своеасаблівы тэатр песні з харавымі, сольнымі, інструментальнымі нумарамі ў аздабленні народных касцюмаў. Большую частку песень рэпертуару калектыву апрацавалі альбо напісалі яго* ***мастацкі кіраўнік, народны артыст Беларусі Леанід ЗАХЛЕЎНЫ*** *і* ***вядучы музыкант Мікалай АЛЕШКА.*** *Такія песні, як «За маладых», «Чарка на пасашок», «Маруся», «Запрагай-ка, бацька, коней» сталі ўжо шырока вядомымі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.*

Гастрольны тур «Бяседа» распачала ў Гродне — дарэчы, на малой радзіме свайго мастацкага кіраўніка Леаніда Захлеўнага.

— Наш тур праходзіць пад назвай «Любіць Беларусь!». Сваёй творчасцю мы хочам паказаць, як любім нашу Радзіму, і запрашаем сваіх слухачоў далучыцца да нас, раздзяліць з намі гэтыя пачуцці, — кажа Леанід Захлеўны.

На канцэртах прагучаць не толькі вядомыя народныя і аўтарскія песні ў выкананні «Бяседы», якія даўно палюбіліся слухачам, але і прэм'ерныя творы. Рэпертуар у калектыву багаты, і ён не практыкуе тыражыраваць адну праграму ва ўсіх рэгіёнах. У розных гарадах яна будзе нечым адметная.

«Белая Русь» і Белтэлерадыёкампанія не ўпершыню звяртаюцца да тэмы гісторыі нашай краіны, яе культуры, традыцый. Першым вопытам супрацоўніцтва ў гэтым кірунку стаў праект «100 песень для Беларусі». Водгукі былі добрымі. І вось — новая акцыя, якая прапануе ўсім зацікаўленым дакрануцца да нашай песеннай спадчыны, атрымаць асалоду ад выдатнай музыкі. А таксама палепшыць сваё веданне беларускай мовы. Разам з «Бяседай» у вандроўцы па краіне ўдзельнічае **вядучая праграмы «Размаўляем па-беларуску» на тэлеканале «Беларусь 3» Алена ТРАЦЭНКА.** Падчас канцэртаў публіцы прапануюць не толькі далучыцца да народнай песеннай творчасці, але і віктарыну, каб паспрабаваць сябе ў якасці моваведаўцаў.





Эмоцыі на сцэне і ў зале.

**Намеснік старшыні ГА «Белая Русь» Аляксандр ШАЦЬКО** зазначыў, што ў навучальных установах цяпер шмат увагі надаецца менавіта беларускай культуры. Нядаўна, напрыклад, падвялі вынікі конкурсу «Залатое пяро «Белай Русі» сярод моладзі да 22-х гадоў. Прыйшло шмат работ пра Беларусь і на беларускай мове. Прычым не проста спампавалі з інтэрнэту нейкі рэферат, а напісалі ад душы, ад сэрца. Значыць, і ў школах, і ў сем'ях на такія тэмы гавораць, патрыятычныя імкненні дзяцей і моладзі падтрымліваюць.

Гэта тычыцца і папулярызацыі нашай песеннай спадчыны. Хтосьці лічыць, што яна нецікавая? Але той жа ансамбль «Бяседа» заўсёды збірае аншлагі і ў малых, і ў вялікіх гарадах. Людзі ахвотна прыходзяць на канцэрты, бо любяць беларускія песні. І не толькі, дарэчы, у нашай краіне.

— Народныя і аўтарскія беларускія песні настолькі прыгожыя, душэўныя, што мы іх выконваем з гонарам, — зазначае Леанід Захлеўны. — І ўсюды яны ўспрымаюцца гэтак жа эмацыянальна, як мы спяваем. Іх з захапленнем сустракаюць не толькі нашы землякі, але, напрыклад, і карэйцы, кітайцы, венесуэльцы. Напэўна, толькі таму, што ўсё робіцца шчыра, ад душы. А публіку не падманеш. Людзі быццам уваходзяць у «гульню», якую мы ім прапануем. Спяваюць з намі, танчаць пад нашу музыку. Для артыстаў такая еднасць са сваімі слухачамі — самае дарагое.

**Салістка ансамбля «Бяседа» Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** перакананая, што павагу да беларускай спадчыны трэба выхоўваць з дзяцінства:

**«Сваёй творчасцю мы хочам паказаць, як любім нашу Радзіму, і запрашаем сваіх слухачоў далучыцца да нас, раздзяліць з намі гэтыя пачуцці».**

— Мне часта даводзіцца бываць у журы розных конкурсаў, і вельмі прыемна, калі пяці-, шасцігадовыя дзеці выконваюць песні на роднай мове. Яны з маленства развіваюцца, імкнуцца ведаць культуру, абрады, гісторыю сваёй краіны. Гэта вельмі радуе, натхняе і нас, прафесійных выканаўцаў. Лічу, што на тэлебачанні, на радыё трэба больш папулярызаваць менавіта народныя беларускія песні.

А што тычыцца асабістых уражанняў... Аўтар гэтых радкоў неаднойчы быў на канцэртах «Бяседы», у тым ліку ў Беластоку, дзе ансамбль выступаў па запрашэнні Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы. І заўсёды — нейкая асаблівая энергетыка ў зале, калі тое, што праходзіць праз душу артыста, закранае і эмоцыі гледача. Хтосьці, мажліва, аб нечым задумаецца, зажурыцца. Альбо парадуецца, усміхнецца.

Так было і на гэты раз. Літаральна за кожную песню зала дзякавала ансамблю гучнымі апладысментамі, а некаторым вядомым хітам гродзенцы падпявалі.

— Проста супер! Таленавіта, нешаблонна, з цікавымі аранжыроўкамі, калі даўняя песня падаецца быццам на сучасны лад, — такія ўражанні засталіся, напрыклад, у Сяргея і Наталлі Васілевічаў.

**Ліда прымала акцыю «Любіць Беларусь!» 3 верасня, а 4-га канцэрт ансамбля «Бяседа» пройдзе ў Слонімскім цэнтры культуры і адпачынку.**

**ДА ВЕДАМА:**

*Тым, хто не трапіць на канцэрт у рамках акцыі «Любіць Беларусь!», засмучацца не варта. Ёй будзе прысвечаны спецыяльны цыкл праграм на тэлеканале «Беларусь 3». Сачыць за навінамі акцыі можна на старонцы тэлеканала ў інтэрнэце http://3belarus.by/, а таксама на сайце Белтэлерадыёкампаніі http://www.tvr.by/.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**

■ Ёсць нагода

# З РАЗРАДУ ЗАБАЎЛЯЛЬНЫХ — У СУРАЗМОЎЦЫ

**«Мінская хваля» адзначае дзень нараджэння! 4 верасня — у сваім музычна-забаўляльным эфіры, а 12 верасня — на плошчы Бангалор у Мінску. Там на Дзень горада ў канцэрце прагучаць не толькі выступленні «зорак» эстрады, але і найлепшых калектываў мастацкай самадзейнасці раёнаў Мінскай вобласці.**

Радыёстанцыі спаўняецца 11 гадоў. Пройдзены этап станаўлення, пражыты і першы год другога дзесяцігоддзя. Тут моцны калектыў, у аснове якога людзі, што прапрацавалі пяць і больш гадоў. Шмат зроблена, але вынікі вырашылі не падводзіць, таму што галоўнае — тое, што наперадзе. А наперадзе ў станцыі — вялікія пераўтварэнні: «Мінская хваля» пастараецца перайсці з разраду музычна-забаўляльных станцый у іншы, найменш прадстаўлены ў беларускім эфіры разрад — радыё-суразмоўца. Тут будуць не толькі музыка і мадэратары-вядучыя, што весяляць, але і змястоўныя навіны, цікавыя факты і госці. Размоўны фармат заўсёды быў папулярным, прынамсі ў Расіі і Украіне. І з'яўленне дыялога ў эфіры бясспрэчна прыцягне ўвагу аўдыторыі.

У **дырэктара «Мінскай хвалі» Тамары ВЯЦКАЙ** ёсць дакладнае разуменне таго, як трэба працаваць:

— Па меры магчымасці мы пяройдзем на парнае вядзенне навін, выпускі будуць напаўняцца «сінхронамі», што дазволіць рабіць паведамленні паўнавартаснымі, з каментарыямі экспертаў і спецыялістаў-прафесіяналаў. Геапалітычны складнік таксама працуе нам на руку — у нас ёсць магчымасці аператыўна інфармаваць аўдыторыю аб падзеях у рэгіёнах Мінскай вобласці, з прыцягненнем журналістаў з «месцаў». Размовы без купюр; усё, што абмяркоўваюць «на кухнях»; адказы на актуальныя пытанні; сувязь улады і народа; аповеды пра жыццё бежанцаў і тых, для каго Беларусь стала другой радзімай. А таксама — навінкі музыкі і рэтра, дзясятка найлепшага айчыннага музычнага прадукту і сусветная дваццатка, урокі бізнесу для пачаткоўцаў, жыццё валанцёраў і тых, каму яны бескарысліва дапамагаюць, гісторыя месцаў і людзей Міншчыны, нарэшце, казка на ноч — новае, цікавае, нязведанае. Акрамя рэтра-праграмы, дзе будуць гучаць добрыя песні часоў СССР, музыка сацыялістычных краін і іншая замежная песенная «класіка», плануецца і праграма «Нашы песні» (беларускія). Не толькі старыя і апошняга дзесяцігоддзя, але і прэм'еры.

А яшчэ «Мінская хваля» пачынае ўнікальную акцыю з Аляксандрам Сухаравым, лідарам «Эківокаў», і ўпраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама — «Пехатой на «Хвалі» з любоўю да краіны». Ён на самой справе пойдзе пешшу ў канцы верасня проста са студыі па гарадах і вёсках з канцэртамі ў дамах культуры і клубах аграгарадкоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*




ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2015 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

*Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.*

## АЎТОРАК, 8 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы.
**9.10, 22.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Серыял «Цікаўная Варвара 2». Заключная серыя.**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Дэтэктыў «Выходжу цябе шукаць 2».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Серыял «Цікаўная Варвара 3». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.40** Буйным планам.
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 15.55** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**10.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.10** «Зразумець і абясшкодзіць».
**12.00, 17.55 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь».**
**13.05, 0.20 Серыял «Косці».**
**14.00, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 1.05** «Пін-код».
**20.55** Цела чалавека.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.45** Футбол. Еўра-2016. Кваліфікацыя. Беларусь — Люксембург.
**23.45** Футбол. Еўра-2016. Кваліфікацыя. Агляд гульнявога дня.
**1.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50, 13.15, 19.05, 0.55** «Калейдаскоп».
**8.00, 19.15 «У крузе першым». Драма.**
**9.45, 17.30 «Гісторыя Тома Джонса Знайдыша». Меладрама. 1-я серыя.**
**11.20, 23.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці пісьменніка і драматурга Віталя Вольскага.
**11.45 «Альпійская балада». Кінааповесць.**
**13.25 «Плач пералётнай птушкі». Драма.**
**14.40** Творчы вечар народнага артыста СССР Льва Дурава.
**15.50 «Казка вандраванняў». Фільм-казка.**
**20.45** «Калыханка».
**21.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**21.30 «Авадзень». Драма.**
**23.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**0.00** «У гасцях у Барыса Аверына». Расійская актрыса, тэатразнаўца і пісьменніца Тамара Пяткевіч.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 7.45, 1.15** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Спорт-мікс.
**8.05, 10.50, 22.10** Грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**10.10** Час футбола.
**12.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Юнацтва» (Мінск).
**13.50** Веславанне акадэмічнае. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**16.00** Більярд. Камандны чэмпіянат свету.
**17.35** Футбол. Кваліфікацыйны турнір. ЧЕ-2016. Украіна — Беларусь.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Трактар» (Чэлябінск).
**21.45** Спорт-кадр.
**0.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Аднакласнікі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Лепш не бывае».**
**23.05 Камедыя «Выведнік».**
**0.45 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».**
**2.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Уся праўда пра Вангу».
**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40 «Салдаты 9». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Наша справа».
**14.05 Фантастыка «Галодныя гульні».**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Дакументальны праект»: «Помста Сусвету».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!».

### МІР

**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.20** «Дакументальны праект»: «Нябачныя госці».

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 1.40 Маст. фільм «Мілы, дарагі, каханы, адзіны».**
**11.10 Маст. фільм «Каханы па найме».**



**13.00, 16.00, 19.00, 22.05, 23.10** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.10** Дак. серыял «Давайце разбярэмся!».
**14.15 Серыял «Мужчына ўва мне».**
**16.20, 5.15** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**19.25 Серыял «Асабістая справа капітана Руміна».**
**21.15 Серыял «Справа была на Кубані».**
**22.15** Ток-шоу «Слова за слова».
**23.25 Маст. фільм «Прафесар у законе».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.00 Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка!»**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.00, 23.10 Серыял «Непадкупны».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**7.10, 8.05 Серыял «Ляснік».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных.Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.40** «Справа густу».
**15.10 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
Списки акционеров для регистрации участников внеочередного общего собрания составляются **на 04 сентября 2015 г.**

Участникам собрания при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

**Телефон для справок: (8-017) 295-23-68.**

***Совет директоров.***

УНН 100064838.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 06 октября 2015 года торгов с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ЗАО «АВТОКОМБИНАТ №2»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «М1/к-м Ангар» общей площадью 868 кв.м, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-1108, с составными частями и принадлежностями: производственно-складское помещение, насосная, пристройка (назначение: здание многофункциональное) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Харьковская, д. 4 |
| **Продавец имущества** | ЗАО «АВТОКОМБИНАТ № 2», ул. Семенова, 35, 220006, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 5 652 483 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 565 000 000 белорусских рублей |
| **Условия торгов** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Дальнейшее использование объекта недвижимости и развитие территории согласовывается с комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома. |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «АВТОКОМБИНАТ № 2», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **06 октября 2015 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.09.2015 по 02.10.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)213-01-54 (ЗАО «АВТОКОМБИНАТ № 2»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ земельных участков в г. Кобрине Брестской области 8 октября 2015 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 1) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007420 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 13 498 260* |
| 2. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 2) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007421 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 11 527 251* |
| 3. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 3) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007423 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 12 171 883* |
| 4. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 4) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007425 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 11 313 709* |
| 5. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 6) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007426 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 12 171 883* |
| 6. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 7) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007427 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 11 313 709* |
| 7. | г. Кобрин, ул. Интернациональная (участок № 8) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 лет | 124350100001007429 | 0,0030 | Асфальтированный подъезд | 10 000 000 | 1 000 000 | 12 171 883* |

** и расходы на публикацию извещения в СМИ*

**ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНОВ –
КОБРИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ.**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка на расчетный счет 3641000000011 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – **по 2 октября 2015 г. включительно,** а также заключает с Кобринским районным исполнительным комитетом соглашение.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Индивидуальный предприниматель:** копию документа, подтверждающего регистрацию индивидуального предпринимателя, копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования, а в случае участия в аукционе представителя индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками на местности.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

***Аукцион признается не состоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется единственному участнику при его согласии с внесением платы в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).***

**Аукцион состоится 8 октября 2015 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**

**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням по 2 октября 2015 г. включительно.**

**Тел. для справок 8(01642) 2-28-11, 2-32-82.**

**Информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by**

Меліціна СТАНЮТА:

# «АД ГЛЕДАЧОЎ Я ЗАРАДЖАЮСЯ, ЯК БАТАРЭЙКА»

## Хто натхняе спартсменку на новыя перамогі

**На наступным тыдні наймацнейшыя грацыі планеты збяруцца ў Германіі, дзе пройдзе 34-ы чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы. Яны чарговы раз будуць здзіўляць нас сваёй прыгажосцю і абаяннем, а разам з тым спаборнічаць. Бо на кану сёлета не толькі званне найлепшай у свеце, але і алімпійскія ліцэнзіі. Нашы дзяўчаты ўжо прывучылі балельшчыкаў да яркіх выступленняў і медалёў, таму і на гэты раз чакаем ад іх перамог.**



Напярэдадні ад'езду ў Штутгарт мы сустрэліся з першым нумарам зборнай, чалавекам, які ўвасабляе беларускую мастацкую гімнастыку. Меліціна Станюта расказала «Звяздзе» пра сваю гатоўнасць да турніру, інтарэсы па-за спартыўнай залай і гены тэатральнай прабабулі.

### «САМАЯ СУР'ЁЗНАЯ САПЕРНІЦА — ГЭТА Я»

***— Меліціна, апошні этап падрыхтоўкі амаль завяршыўся. Вы задаволены сабой?***

— Сёлета была вялікая колькасць этапаў Кубка свету, і гэта добра: чым больш выступаеш, тым больш упэўненасці ў сабе. Мяркуючы па тым, як я рабіла праграму, усё ідзе па плане, складваецца добра. Час, які мы правялі ў Мінску перад чэмпіянатам свету, выкарыстоўвалі для таго, каб давесці ўсе практыкаванні да ідэалу. Галоўнае — не пераскочыць пік формы: для любога спартсмена гэта вельмі важна.

***— Ці ёсць у гэтым сезоне любімы від у праграме, які атрымліваецца лепш за астатнія?***

— Не, яны ўжо настолькі адпрацаваныя, настолькі мае. Я ўжо даўно, гадоў з 10, не вылучаю нейкае практыкаванне. Кожны год праграма змяняецца, у гэтым яна мне вельмі падабаецца. Усе вобразы розныя, але яны падыходзяць мне на сто працэнтаў. Праграма гімнасткі шмат у чым залежыць ад стану яе душы. Калі яна можа быць рознай, то чаму б не паказаць гэта? Калі ўсе практыкаванні вытрыманы ў адным стылі — гэта сумна і для суддзяў, і для гледачоў, і гэта, вядома, не паказвае клас гімнасткі, бо, акрамя спартсменак, мы павінны быць яшчэ і актрысамі.

**Лідарскія якасці ў мяне з дзяцінства, таму, калі б я была другой, зрабіла б усё, каб стаць першай.**

***— Гэты чэмпіянат свету яшчэ і ліцэнзійны. Ёсць дадатковая нервознасць з-за гэтага?***

— Стараюся не думаць пра гэта. Я ад прыроды вельмі адказны чалавек, таму ў дадатковай матывацыі не маю патрэбы.

***— Ці прыемна ў Германіі выступаць? Там любяць мастацкую гімнастыку?***

— Без сумневаў! Кожны год немцы праводзяць Гран-пры, там заўсёды шмат заўзятараў і прыемная атмасфера. Год таму ў Штутгарце праходзіў этап Кубка свету, у іх вялікая арэна, і ўся яна была запоўненая.

Для мяне вельмі важна адчуваць ад гледачоў гэтую энергію, даваць ім эмоцыі і атрымліваць аддачу, я зараджаюся ад іх, як батарэйка. Успамінаю наш чэмпіянат Еўропы ў Мінску, было вельмі складана. Так жа складана, як на маёй першай Алімпіядзе. Я разумела, што на мне, як першым нумары, велізарная адказнасць. Людзі прыйшлі падтрымаць нас, чакалі медалёў, і правільна рабілі, што чакалі. Да гэтага часу памятаю, як стала перад першым відам; чаго толькі не рабілася перад тым ўнутры! Выходжу на дыван — і зала выбухае. Гэты крык зняў палову напружання.

***— Як заўсёды, галоўнымі канкурэнткамі на гэтым чэмпіянаце будуць расіянкі?***

— Мая самая сур'ёзная саперніца — гэта я. Ведаю, што мне проста трэба выйсці і зрабіць тое, што я напрацавала, тое, што я ўмею. А ўмею ў сваіх праграмах усё. Галоўнае — справіцца з хваляваннем, якое прысутнічае заўсёды (дарэчы, калі яго няма — гэта дрэнна, праверана на ўласным вопыце). Яго проста трэба накіроўваць у патрэбнае рэчышча, і тады хваляванне выліваецца ў павышаную канцэнтрацыю, сабранасць, падказвае выйсце з складанай сітуацыі.

***— Праграма доўжыцца паўтары хвіліны. Якія думкі ў гэты час пралятаюць у галаве?***

— Ой, гэта ж шмат часу! За яго можна паспець насварыцца на сябе, прадмет, з якім ты працуеш у гэты момант, даць указанні. А часам наогул злавіць сябе на нейкіх дзіўных думках не аб гімнастыцы: напрыклад, адчуць пах папкорну, які есць хтосьці з гледачоў, або пазнаць чыйсьці голас.

### ЛЁС ДАЕ ВЫПРАБАВАННІ

***— Ці накладвае званне першага нумара зборнай дадатковую адказнасць?***

— Так, дзесьці ты разумееш, што ад цябе патрабуюць больш, чым ад іншых, не маеш права на памылку, павінна ў любой сітуацыі дапамагчы камандзе. Але ў жыцці быў перыяд, пасля аперацыі, калі я была другім нумарам і адчувала сябе некамфортна. Лідарскія якасці ў мяне з дзяцінства, таму, калі б я была другой, зрабіла б усё, каб стаць першай.

***— Ці стаў той перыяд цяжкай траўмы ступні, пра які вы ўзгадалі, пераломным у кар'еры?***

— Гэта быў канец 2010-га — пачатак 2011 года, у мяне тады ўсё ішло па нарастальнай: з юніёрскага ўзросту адразу пайшлі медалі, я ўпершыню ў гісторыі Беларусі выйграла медаль у шматбор'і, усё было настолькі выдатна, што лёс вырашыў выпрабаваць: спачатку ён даў мне аванс, а потым выпрабаванне.

Каб проста хадзіць, мне не патрабавалася аперацыя, але, каб працягваць выступаць, яна была неабходная. На аднаўленне мне далі тры месяцы. Калі час падыходзіў, я працягвала кульгаць. У той момант мала хто верыў, што я вярнуся, нават мама казала: «Меліта, можа, хопіць?» А я разумела, што яшчэ не сказала сваё слова ў мастацкай гімнастыцы, таму зрабіла ўсё магчымае, каб вярнуцца.

Станюта да аперацыі і пасля — гэта зусім розныя людзі, я як быццам вырасла на прыступку, стала працаваць, што называецца, з мазгамі, таму што разумела — усё можа скончыцца ў любы момант. Пазней выступленні пачалі прыносіць мне задавальненне, я стала адчуваць гледачоў, зразумела, што выступаю ў першую чаргу для іх, яны натхняюць меня на новыя перамогі.

### РАБІЦЬ ДАБРО НЕСКЛАДАНА

***— Усё часцей можна бачыць вас у сацыяльных праектах. Што прымушае знаходзіць час для гэтага?***

— Калі ўдзельнічала ў адной з дабрачынных акцый, пачула такую фразу: «Чым бы мы ўсе ні займаліся па жыцці, магчыма, наша прысутнасць тут — лепшае, што мы можам зрабіць». Яна мне вельмі запала ў душу, і я з ёй згодна. Не ўсіх лёс надзяліў тым, што ёсць у нас. У кагосьці нешта не атрымалася, не склалася, але ёсць людзі, якія могуць дапамагчы. Нездарма ж прырода так падзяліла нас, і, магчыма яна выпрабоўвае менавіта тых, у каго ўсё добра, наколькі мы чалавечныя, наколькі маем спагадлівае сэрца. Дапамагчы — гэта зусім не складана; мне здаецца, я адчуваю сябе пасля гэтага лепш, дыхаецца лягчэй.

**Наогул, мой дэвіз: у мяне ёсць я, і ў нас усё атрымаецца!**

***— У той жа час і на старонках «глянцу» вы з'яўляецеся ўсё часцей.***

— У першую чаргу я раблю гэта дзеля папулярызацыі мастацкай гімнастыкі. У 2009 годзе, памятаю, прыехала са свайго першага чэмпіянату свету і прывезла медаль не толькі ў камандным першынстве, але і ў практыкаванні з абручом. Мы прыехалі спачатку ў залу на «Дынама», там сустрэлі, павіншавалі. Я, такая шчаслівая, іду дадому з чамаданам, абруч у чахле целяпаецца на плячы. І тут мне насустрач ідзе мужчына і кажа: «Дзяўчына, навошта вам гэтая шына?» Для мяне гэта быў удар: у нашым гімнастычным свеце толькі што было такое шчасце, а тут рэальнасць, дзе людзі нават не ведаюць, што такое мастацкая гімнастыка. У Беларусі не так шмат паспяховых відаў спорту. Крыўдна, калі нас не заўважаюць, таму ў мяне і з'явілася ідэя як мага больш актыўна папулярызаваць наш від. Спартсмены толькі могуць заваёўваць медалі, каб пра іх гаварылі, і тое не заўсёды гэта дзейнічае. У мяне ёсць такая невялікая мара: калі скончу выступаць, буду працягваць папулярызаваць спартсменаў і асабліва мастацкую гімнастыку.

***— Чаму вы лічыце гэта важным?***

— Калі паглядзець на свет глабальна, па якіх крытэрыях ведаюць краіну? Так, гэта могуць быць вялікія дзеячы культуры і навукі, але спорт — самая яскравая іміджавая праява. Ён гуртуе людзей больш за ўсё: колькі заўзятараў, колькі футбольных і хакейных прыхільнікаў — цэлыя міжнародныя супольнасці! На Алімпійскія гульні людзі з'язджаюцца з усёй планеты, спорт аб'ядноўвае. Любы чалавек на зямлі нейкім чынам ды прывязаны да якога-небудзь спорту, хай нават не прафесійна.

А па-другое, у нас у краіне шмат маладых спартсменаў, якія не даходзяць да старэйшага ўзросту, таму што не атрымліваюць належнай увагі. На этапе юнацкага спорту неабходна заахвочваць атлетаў. Дапусцім, калі нашы спартсмены выйграюць юніёрскі чэмпіянат Еўропы, бо для іх гэта вяршыня, яны яшчэ не могуць удзельнічаць у сусветных і алімпійскіх турнірах. На гэта глядзяць скрозь пальцы. Яны маюць патрэбу ва ўвазе, таму што гэта падцягвае, стымулюе, прымушае расці. Гэта не праблема, а ўсяго маленькі аспекцік, які дазволіць нашай краіне стаць яшчэ больш спартыўнай.

### ПРА ХАРАКТАР, ТЭАТР І МУЖЧЫН

***— Якая ж Меліціна Станюта за межамі гімнастычнай залы?***

— У спорце я вельмі ўпартая, амбіцыйная, часам нават жорсткая. Калісьці і ў жыцці я была такая ж, але своечасова зразумела, што гэта няправільна. Спартыўны свет жорсткі, а ў паўсядзённасці людзі могуць прыходзіць ад гэтага ў шок. Мне нават мама казала: «Меліта, ты павінна вучыцца быць проста дзяўчынай, а не толькі спартсменкай». Нейкі час я старалася гэта ліквідаваць, і ўсё наладзілася. Гэта мая неспартыўная перамога.

Тым не менш вось гэтая дысцыплінаванасць, уменне дамагацца сваёй мэты, нават дзесьці перфекцыянізм, дапамагаюць мне і ў жыцці. За паўтара дня выхаднога я паспяваю, напэўна, больш, чым нехта за тыдзень, таму што ўсё распісана: я вельмі цаню свой час. Наогул, мой дэвіз: у мяне ёсць я, і ў нас усё атрымаецца! Усё ў нашых руках, як бы гэта банальна ні гучала.

***— У многіх інтэрв'ю вы гаворыце пра сваю любоў да тэатра і літаратуры. Гэта перадалося па генах? (Прабабуля Меліты — славутая артыстка Стэфанія Станюта. — Аўт.)***

— Гэта гены плюс выхаванне бацькоў. У мяне дома вельмі вялікая бібліятэка, бацькі мне з дзяцінства шмат чыталі. Наогул, для мяне важна, калі я адпачываю, насыціцца ўражаннямі. Лепш за ўсё гэтаму спрыяюць, вядома, падарожжы, але не заўсёды ёсць магчымасць. Тады на дапамогу прыходзяць кнігі і тэатр. Калі ведаю, што буду ў Мінску нейкі час, адразу пачынаю глядзець афішы.

**Я добра ведаю родную мову, гэта з дзяцінства. Калі б зараз не змагла размаўляць па-беларуску, мне было б вельмі сорамна.**

Вельмі люблю Купалаўскі тэатр. Не таму, што там працавала мая прабабуля — яе на сцэне я ніколі не бачыла, перш за ўсё для мяне яна была родным чалавекам, а не актрысай. Там выдатныя акцёры, і яны выдатна працуюць. Таксама ў маіх фаварытах Тэатр беларускай драматургіі, у апошні час часта хаджу туды: у іх з'явілася шмат новых спектакляў. Не ў крыўду прыхільнікам тэатра імя Горкага, але мне там не падабаецца.

Дарэчы, пра балет і оперу: оперу наогул не вельмі люблю, а вось прафесіянальны, якасны балет мне падабаецца. Мастацкая гімнастыка і балет не тое каб блізкія (адно — спорт, другое — мастацтва), але мастацкая гімнастыка пайшла ад Айседоры Дункан, якая ў свой час зняла пуанты.

***— А пра літаратуру?***

— Я вялікая прыхільніца Рэмарка, засталася ўражаная таксама Габрыэлем Гарсіа Маркесам. А калі казаць пра тое, што прачытала не так даўно, то гэта кніга пра вялікага танцоўшчыка Рудольфа Нурыева (параіла, дарэчы, Люба Чаркашына). Глыбокі адбітак пакінулі творы Халеда Хасейні, я нават плакала, хоць складана выціснуць з мяне сентыментальныя пачуцці.

Рэдка перачытваю кнігі, але ў адну з апошніх паездак узяла з сабой «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», нешта мне так захацелася казак. Наогул, беларускія легенды настолькі цікавыя, апавяданні з гэтай тоненькай кніжкі вельмі ўразілі.

***— Дарэчы, вы выдатна размаўляеце па-беларуску.***

— Я добра ведаю родную мову, гэта з дзяцінства. Калі б зараз не змагла размаўляць па-беларуску, мне было б вельмі сорамна. Яшчэ добра валодаю англійскай і французскай, планую вывучыць італьянскую.

***— Пра тое, што ў гімнастак строгія дыеты, ведаюць усе. А чаму вы аддаяце перавагу, калі можна адступіць ад рэжыму?***

— Мяне можна не карміць ніякімі прысмакамі, дайце толькі морапрадукты: васьміногі, кальмары, крэветкі. Я іх люблю, імі магу замяняць дэсерты, хоць салодкае таксама люблю, але выбарачна. Шакалад — абажаю, пірагі — не мае. Вельмі люблю «Кіеўскі» торт: памятаю, прывезла яго з чэмпіянату свету, які якраз праходзіў ва Украіне, дык ела цэлы дзень *(смяецца)*.

***— У сінхронным плаванні ўжо з'явіліся мужчыны. Усё часцей кажуць, што яны могуць прыйсці і ў мастацкую гімнастыку...***

— Ёсць адэкватная мужчынская мастацкая гімнастыка (хутчэй, іх выступленні можна назваць акрабатыкай з прадметам), гэта выдатна. А вось іспанцы, якія выходзяць на дыван у камбінезонах і цалкам робяць нашы праграмы. Мне глядзець на гэта, шчыра кажучы, не вельмі прыемна. У аснове мастацкай гімнастыкі ляжыць грацыя, пластыка, жаноцкасць. Гэтыя словы ніяк не вяжуцца з мужчынамі, таму я лічу гэты від чыста жаночым. І заклікаю пакінуць яго нам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва Меліціны Станюты.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Пошук золата, дый увогуле скарбаў рознага кшталту — адна з любімых тэм прыгодніцкай літаратуры. І тут адразу ўспамінаюцца не толькі, напрыклад, класічныя замежныя творы — тыя ж «Залаты павук» Э. По, «Востраў скарбаў» Р. Стывенсана, «Копі цара Саламона» Г. Хагарда, але і проза сучасных беларускіх аўтараў: «Шчарбаты талер» Андрэя Федарэнкі, «Скарб князёў Радзівілаў» Вольгі Тарасевіч, «Золата забытых магіл» і «Сэрца мармуровага анёла» Людмілы Рублеўскай, «Залатыя апосталы Радзівілаўскія» Аляксандра Аляшкевіча ды іншыя, што так ці інакш звязаныя з далёкай мінуўшчынай.**

**І вось — новы твор на «залатую» тэму. Віктар Варанец сваё апавяданне пабудаваў на падзеях 1939 года, калі адбывалася ўз'яднанне Беларусі, а адным з месцаў дзеяння выбраў славуты гродзенскі фарны касцёл, фундатарам пабудовы якога стаў сам Вітаўт. На жаль, касцёл быў узарваны ў 1961 годзе, але пра яго гісторыю захавалася шмат цікавых звестак, якія, відавочна, могуць натхніць яшчэ не аднаго пісьменніка.**

**Алесь БАДАК**

# ТАЯМНІЦА ФАРЫ ВІТАЎТА

Віктар ВАРАНЕЦ



«Камандуючаму 27-ай танкавай брыгадай палкоўніку Юшчуку.

Сакрэтна.

Разведгрупа 152-га кавалерыйскага палка 6-га кавалерыйскага корпуса пры вызваленні г. Ліда затрымала адпраўку 2 вагонаў з карцінамі і каштоўнымі металамі, якія належалі Банку Польскаму. Паводле інфармацыі, атрыманай ад арыштаваных супрацоўнікаў гэтага банка, у горад Гродна былі эвакуяваны металічны вагон белага колеру, у якім знаходзіцца каля 2 тон золата ў злітках і манетах.

Загадваю.

1. На працягу сутак, да 21 верасня, сіламі брыгады авалодаць горадам Гродна.

2. Знайсці і ўзяць пад ахову вагон з золатам.

3. Перадаць залаты запас спецыяльна створанай фінансавай камісіі НКУС СССР.

Народны камісар унутраных спраў СССР Л.Берыя.

19 верасня 1939 г.»

Камандзір разведбатальёна маёр Багданаў увайшоў у кабінет камандуючага і зухавата далажыў аб сваім прыбыцці. Юшчук кіўнуў у адказ і працягнуў атрыманую шыфраграму. Маёр хуценька прабег па тэксце вачыма і паклаў паперу на стол.

— Што скажаш, маёр? — запытаўся камбрыг.

— Трэба выконваць загад, таварыш палкоўнік! Ударым і захопім...

Здавалася, Юшчук толькі і чакаў такога адказу. Ён рэзка ўскочыў з крэсла і пачаў адмерваць хуткімі крокамі плошчу кабінета.

— Ага, ударым, — амаль зароў палкоўнік. — А ці ведаеш ты, разумнік, што да Гродна амаль сто кіламетраў, а бензін абяцалі падвезці толькі паслязаўтра, бо тылы адстаюць. А горад трэба ўзяць ужо заўтра. А на чым, скажыце, будзем браць?

Багданаў у адказ толькі развёў рукамі. Юшчук, выплеснуўшы эмоцыі, крыху супакоіўся і працягваў ужо больш спакойным голасам.

— Загад выканаць трэба, і тут нічога не папішаш. Таму, маёр, план будзе наступным. Усё паліва брыгады зліваем у твае машыны, і хуткім марш-кідком 20 верасня авалодваеш станцыяй. І памятай, Багданаў, нас цікавіць не сам горад, не палякі, што там укрыліся, — нам патрэбен гэты занюханы вагон. Ты мяне разумееш, Багданаў?

— Дакладна так, таварыш палкоўнік!

— Даю на распрацоўку дэталяў аперацыі дзве гадзіны. І да мяне з дакладам. Можаце ісці...

У невялічкім пакойчыку дзяжурнага па чыгуначнай станцыі Гродна сядзелі два прыстойна апранутыя мужчыны: дырэктар тытунёвай фабрыкі Чэслаў Валіцкі — кіраўнік мясцовага нацыяналістычнага аддзялення ОЗН (обуз з'еднычэня народовэго) і кіраўнік атрадаў Гродзенскай самааховы, таксама член ОЗН капітан Эдвард Раманоўскі. На стале стаяла некранутая бутэлька віна, асветленая дрыготкім полымем свечкі. Акно, за якім панавала цёмная вераснёўская ноч, было шчыльна завешана коўдрай. Дакладваў Раманоўскі.

— Такім чынам, пан Валіцкі, мы здолелі вывезці золата і асігнацыі Банка Польскага прама з-пад бальшавіцкага носа. У Лідзе засталася амаль нічога не вартая драбната. Грошы пайшлі адразу на аплату добраахвотнікам з баявых атрадаў. А вось што рабіць з золатам? Можа, адправіць пад аховай на Варшаву?

— Не і яшчэ раз не, — Валіцкі нахіліўся над сталом і сцішана, амаль шэптам, працягваў: — Варшава ўжо пад немцам. Гродна праз дзень-два будзе бальшавіцкім. Таму, дарагі мой капітан, ехаць няма куды. Значыць, золата трэба схаваць у горадзе. Я ўпэўнены, што Гітлер са Сталіным яшчэ счэпяцца ў крывавай бойцы. А тады зноў адродзіцца вялікая Рэч Паспалітая «ад мора і да мора». І ёй спатрэбіцца гэтае золата.

— Я згодны, пан Валіцкі. Але дзе і як будзем захоўваць гэтае багацце?

Валіцкі павольна ўстаў, узяў крэсла і сеў каля Раманоўскага.

— У мінулым годзе пробашч Фары Вітаўта па сакрэце паказваў мне падземныя лабірынты, што цягнуцца ад касцёла пад горад. І я ўгаварыў святога айца «пазычыць» мне адно скляпенне для асабістых патрэб. Рабочыя яго крыху падрамантавалі, паставілі дзверы. І калі ласка — цудоўная схованка. Ведалі пра гэтае месца толькі два чалавекі — я і пробашч.

— А як жа рабочыя? — здзівіўся Раманоўскі.

Валіцкі загадкава ўсміхнуўся.

— Яны добра адсвяткавалі заканчэнне працы, падпілі і ад выпадковага агню згарэлі ў старой вінярні, што стаяла ў Капліцы. Вы, пэўна, чулі пра тую трагедыю... Больш за тое, літаральна праз тыдзень чымсьці моцна атруціўся пробашч і неўзабаве таксама аддаў Богу душу.

— Які жах! — засмяяўся капітан. — І зноў толькі двое будуць ведаць пра схрон. Дык можам пачынаць аперацыю?

— Так, — пагадзіўся Валіцкі. — Але каму даручым яе выкананне? Гэта ж не людзі навокал, а прадажнае быдла. Што ім да ідэі Вялікай Польшчы...

Раманоўскі ўстаў і па-ваеннаму зычна прамовіў:

— Найлепшым варыянтам для такой справы лічу групу Яфіма Чапурнога.

— Гэта хто? — запытаў Валіцкі.

— Былы пятлюраўскі камандзір. Кіруе ўкраінскімі нацыяналістамі. За грошы пойдзе на ўсё. Сапраўдны галаварэз.

— Але ці не будзем мы з ім потым мець клопат?

— Нешта мне падказвае, што для Чапурнога «потым» не прыйдзе ніколі, — зноў засмяяўся Раманоўскі.

Валіцкі цяжка падняўся з-за стала.

— Ну што ж, пане Эдвард, тады за справу. Чакаю вас з золатам праз тры гадзіны каля касцёла. Трэба да світання паспець.

Каля васьмі гадзін раніцы ў Гродна ўехаў батальён маёра Багданава. Адзінаццаць танкаў БТ, бронемашына, санітарная машына і радыёстанцыя 5-АК. Пяцьдзясят чалавек жывой сілы. Гэта ўсё, што змог сабраць Багданаў за такі кароткі час. Дзесьці яшчэ пад Бераставіцай тупацелі ў пешым строі стралковая рота і ўзвод сапёраў, але чакаць іх ужо не было часу. Крыху павагаўшыся, маёр вырашыў не губляць каштоўныя гадзіны на разведку, а адразу выконваць загад камандавання. Сабраўшы каля бронемашыны малодшых камандзіраў, Багданаў разгарнуў карту Гродна і вызначыў кожнаму задачу. Узвод лейтэнанта Якава Чарнова з трыма танкамі праз чыгуначны мост выходзіць прама на вакзал і захоплівае азначаны вагон з золатам. Узвод старшага лейтэнанта Міхаіла Яўсеева ў суправаджэнні таксама трох танкаў адцягвае ўвагу праціўніка на сябе, для чаго атакуе цэнтральную частку горада, захоплівае тэлеграф і пошту на вуліцы Элізы Ажэшкі. З астатнімі пяццю танкамі і бронемашынай Багданаў утрымлівае да падыходу сваіх мост цераз Нёман і чыгуначны пераезд на рагу вуліц З'езд і Гажэльнай.

Першым рушыў узвод Яўсеева. На максімальнай хуткасці танкі выскачылі на мост цераз Нёман і паляцелі да супрацьлеглага берага. Палякі сустрэлі іх агнём з зенітнай гарматы. Неўзабаве яркім полымем успыхнуў адзін з танкаў. Астатнія, не звяртаючы на страту ўвагі, працягвалі прабівацца да цэнтра горада. На вуліцы Маставой польскі жаўнер выскачыў з дзвярэй аптэкі і кінуўся з супрацьтанкавай гранатай пад гусеніцы танка. Выбух — і чарговы танк прагна пачаў паглынаць бязлітасны агонь. Адзін з танкістаў паспеў выскачыць з машыны, але, ахоплены полымем, тут жа ўпаў на дарогу. Апошні з танкаў усё ж дасягнуў вуліцы Ажэшкі, дзе снарад, выпушчаны з польскай гарматы, трапіў у левую гусеніцу. Машыну раскруціла на месцы, і тут жа з розных бакоў пасыпаліся бутэлькі з бензінам, якія падрыхтавалі польскія гімназісты. Так загінуў экіпаж старшага лейтэнанта Яўсеева.

Тым часам узвод Чарнова, практычна нікім не заўважаны, уварваўся на чыгуначны вакзал. Лейтэнант разам з радавым Несцеравым выбег на перон. На рэйках тут і там стаялі тры дзясяткі розных вагонаў без цягнікоў. Чарноў схапіў за каўнер нейкага мужчыну ў форме чыгуначніка, які палахліва выглядваў з-за скрыні з пяском.

— Дзе металічны вагон з Ліды? — раз'юшана прахрыпеў лейтэнант.

— А то там, прошэ пана, — дрыготкім ад страху голасам прамармытаў чыгуначнік і паказаў пальцам на найбліжэйшы да будынка вакзала вагон з расчыненымі дзвярыма. Нават адсюль было відаць, што ён пусты.

— Куды павезлі скрыні? — зноў затрос Якаў паляка.

— Не вем, пане. Цалу ноц грузілі на аўто і павезлі да цэнтра мяста.

Лейтэнант нарэшце адпусціў чалавека і пабег да танка перадаць па рацыі несуцяшальную вестку Багданаву...

...Цягнік «Берлін — Варшава — Ленінград» перасёк польскую мяжу і бадзёра загрукацеў па тэрыторыі Савецкага Саюза. Сярод нешматлікіх пасажыраў у адным з купэ ехаў высокі стары чалавек, апрануты ў строгі чорны касцюм. Ён пільна ўглядаўся праз акенца ў прыгожыя беларускія краявіды, але не заўважаў іх. Перад вачыма праносіліся іншыя малюнкі.

...Чапурнога і яго хаўруснікаў Раманоўскі расстраляў з аўтамата, як толькі скончылі насіць скрыні з золатам у склеп. Затым зачынілі дзверы і шчыльна пакрылі іх тынкоўкай, зраўняўшы са сцяной. Крыху абкідалі па свежым землёй, каб не надта адрозніваліся ад іншых частак. Прыдзірліва агледзеўшы зробленае, Валіцкі звярнуўся да калегі.

— Пан Раманоўскі! Я спадзяюся на вашу шляхетнасць і слова афіцэра. Пра схованку ведаем толькі мы. Рэч Паспалітую і нас, палякаў, чакаюць цяжкія выпрабаванні. Але мы вытрымаем, і я абяцаю, што знайду пана, калі прыйдзе час адкрыць гэты склеп і пачаць новую гісторыю Польшчы.

Яны паціснулі адзін аднаму рукі і зніклі ў начным змроку.

І вось ён, Чэслаў Валіцкі, праз столькі гадоў пад'язджае да свайго горада. Колькі ўсяго адбылося за гэтыя чвэрць века! Раманоўскі загінуў у Варшаўскім паўстанні, сам Валіцкі быў і ў падполлі, і ў Арміі Краёвай, і англійскай эміграцыі. Але заўсёды верыў, што вернецца ў мілае сэрцу Гродна. І хоць у кішэні пашпарт грамадзяніна Аб'яднанага Каралеўства, у душы Валіцкі ўсё той жа адданы паляк. А яшчэ схованка. Дзве тоны золата ляжаць у яго асабістым склепе. Хаця, ці ляжаць? Валіцкі быў досыць заможным чалавекам, уваходзіў у свой час у савет дырэктараў буйной тытунёвай кампаніі, ды і цяпер, адышоўшы ад спраў, меў добры прыбытак ад акцый той жа кампаніі. І без золата было на што жыць. У дадатак ён быў рэалістам і добра разумеў, што з бальшавіцкай Расіі дзве тоны золата не вывезеш незаўважана. Але паглядзець, дакрануцца да ўласна зробленай тынкоўкі ён можа.

Дзень быў досыць мітуслівы. Раніцай Валіцкага з гасцініцы забралі два прадстаўнікі «Інтурыста», правялі экскурсію па горадзе, звазілі на тытунёвую фабрыку, паказалі новыя мікраераёны. І толькі ўвечары адчапіліся (прынамсі, так яму здалося). Валіцкі застаўся адзін. Ён выйшаў з гасцініцы і павольна пайшоў праз цэнтр па вуліцы Дамініканскай (цяпер яна, зразумела, Савецкая) да плошчы Стэфана Баторыя (цяпер, вядома, таксама Савецкай), дзе і стаіць велічная і бессмяротная Фара Вітаўта ў кампаніі сваіх братоў Францішканскага і Бернардзінскага касцёлаў. На душы было лёгка і хвалююча: і будынкі, і брук, і дрэвы засталіся дакладна такімі ж, як у яго час. Гэта была настальгічная сустрэча з мінулым. А вось і плошча. Зараз па дарожцы налева, да касцёла.

Касцёла на месцы не было. Была роўная плямка скверыка, абсаджаная нейкімі кусцікамі. А храма не было. Валіцкі пачаў разгублена азірацца. Не, ён не памыліўся. Месца дакладна тое ж, але без касцёла. Тады ён спыніў нейкага маладога чалавека і, з цяжкасцю ўспамінаючы даўно забытыя словы, на беларуска-польскай трасянцы запытаў:

— Пшэпрашам пана, але тут колісь быў каталіцкі касцёл. Фара Вітаўта. Дзе ён? Вайна?

Чалавек здзіўлена паглядзеў на Валіцкага, але праз імгненне ўсё зразумеў і прыязна ўсміхнуўся:

— Інастранец?

— Так, інастранец, — пагадзіўся Валіцкі.

— Ясна. Не, касцёл вайну перажыў. Але ж ён сам па сабе перажытак мінулага. Таму тры гады назад касцёл узарвалі, а замест яго зрабілі гэты прыгожы скверык. А калі вам трэба памаліцца, дык вось, яшчэ пакуль стаіць францішканскі. Схадзіце.

І чалавек пакрочыў сабе далей.

Валіцкі з цяжкасцю зрабіў два крокі і сеў на лаўку.

«Найстаражытнейшую Фару Вітаўта і дзве тоны золата — за прыгожы скверык? — мільганула ў яго галаве. — Божа, за што караеш?..»

# «АХ, ГЭТАЕ ВЯСЕЛЛЕ...»



**Па гарызанталі: 9.** Вопратка, у якой маці жаніха тройчы абыходзіла вясельны картэж і абсыпала яго жытам. **10.** Маёмасць, што бацькі давалі маладой пры замужжы. **11.** Невялікі хлеб з пшанічнай мукі, яго звычайна выпякаюць разам з караваем. **13.** Фаза Месяца, калі, па народным павер'і, лепш не спраўляць вяселле. **17.** Адна з галоўных рытуальных страў, што сімвалізуе сямейны дабрабыт, заможнасць. **18.** Вядомы беларускі даследчык народных традыцый, сямейных звычаяў, абрадаў. **23.** Пачуццё, з якім дзяўчына-сірата суботнім ранкам напярэдадні вяселля наведвала магілкі сваіх продкаў. **24.** Рэштка свечкі з вянчання, яе запальвалі падчас бясседы ў нявесты. **25.** Прадмет адзення, які нявестка дарыла свекрыві пасля вяселля. **27.** Спрэчка паміж сваццяй ад маладога і «запарожцамі» — не запрошанымі афіцыйна ў госці жанчынамі; на Палессі гэта выглядала як жартаўлівае спаборніцтва. **29.** Транспартны сродак, на які ў некаторых мясцовасцях дзяўчаты варажылі пра сваё замужжа. **31.** Адзін з адметных рытуальных сімвалаў у сялянскіх традыцыях. **36.** Птушка, што ў фальклорных творах сімвалізуе сватоў. **37.** Месца ў доме, дзе бацькі сустракаюць маладых пасля вянчання. **38.** Па традыцыі яго кідалі пад ногі нявесце пры ўваходзе ў хату свекрыві. **45.** У светаўспрыманні беларусаў яна сімвалізуе рух і змену, уяўляецца надзейным абярэгам.

**Па вертыкалі: 1.** Высокі рытуальны столік у царкве, вакол яго святар тройчы абводзіць маладую пару пры вянчанні. **2.** Абярэмак саломы, якой брат нявесты высцілаў сенцы, перш чым свёкар запросіць яе ў хату. **4.** Пакой, дзе звычайна апраналі дзяўчыну ў вясельны ўбор. **5.** Тканы выраб, традыцыйны атрыбут вясельнага абраду. **7.** У яго, збіраючы дачку да вянца, маці насыпала ў якасці абярэга асвячоны спасаўскі мак. **8.** Знак павагі, удзячнасці бацькам пры развітанні маладой з родным домам. **15.** Патаемнае жаданне, што загадвалася падчас дзявочай варажбы. **16.** Хрышчоная маці. **19.** Усталяваны парадак побыту, захавальніцай якога спрадвеку з'яўлялася жанчына. **20.** Скібка хлеба з мёдам, у доме жаніха ёю частавалі маладых, каб жыццё было салодкім і заможным. **21.** Дзяжа, пакрытая кажухом; на яе садзілі дзяўчыну перад шлюбам. **22.** Галаўны ўбор, які пасля абгортвання сямейнай пары здымалі са свата і надзявалі на жаніха. **26.** Месца, дзе здзяйсняецца галоўная вясельная падзея — абрад вянчання. **27.** Мэбля, якой вясковая моладзь перагароджвае дарогу, каб спагнаць з маладых выкуп. **28.** Паслявясельная гульня з пераапрананнем, распаўсюджаная ў многіх мясцовасцях. **29.** Дзень, калі звычайна хадзілі ў сваты. **30.** Тонкая прытворная насмешка, што адрасавалася жаночым гуртам хлопцу-пераростку падчас масленічнага абраду «Калодка». **31.** Каляровая палоска тканіны, якую прышпільвалі на вэлюм нявесты-сіраты. **32.** Забава, смешнае здарэнне. **33.** Галінкамі гэтага дрэва аздаблялі адзенне ўдзельнікаў вяселля на брэсцкім Палессі.

**Па дугах: 3.** Гаспадарчая прылада, на ёй вазілі па вёсцы бабку-павітуху напрыканцы хрэсьбін. **6.** Кінарэжысёр, пастаноўшчык фільма «Вясельная ноч». **12.** Мясная і малочная ежа, без якой абыходзяцца ў пост, таму звычайна вяселлі ладзяць на Тройцу, Каляды і Пакровы. **14.** Невялікая талерка для серыроўкі стала. **34.** Адзін з галоўных завадатараў вясельных гулянняў. **35.** Сялянскі абутак з лыка, на Палессі пры сватанні яго кідалі ў хату дзяўчыны. **39.** Муж, што жыве ў доме жонкі. **41.** Падабенства народных традыцый, звычаяў, характэрнае для розных мясцовасцяў.

**Склаў Іосіф КАРПЫЗА,** *г. Ляхавічы.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 9.** Кажух. **10.** Пасаг. **11.** Булка. **13.** Поўня. **17.** Каша. **18.** Крук. **23.** Скруха. **24.** Агарак. **25.** Фартух. **27.** Сварка. **29.** Сані. **31.** Сноп. **36.** Голуб. **37.** Парог. **38.** Венік. **45.** Нітка. **Па вертыкалі: 1.** Аналой. **2.** Ахапак. **4.** Камора. **5.** Ручнік. **7.** Абутак. **8.** Паклон. **15.** Мара. **16.** Кума. **19.** Уклад. **20.** Луста. **21.** Пасад. **22.** Шапка. **26.** Храм. **27.** Стол. **28.** «Цыганы». **29.** Субота. **30.** Іронія. **31.** Стужка. **32.** Пацеха. **33.** Каліна. **Па дугах: 3.** Барана. **6.** Карпаў. **12.** Скорам. **14.** Сподак. **34.** Музыка. **35.** Лапаць. **49.** Прымак. **41.** Аналаг.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.22 | 19.59 | 13.37 |
| Віцебск — | 6.10 | 19.46 | 13.36 |
| Магілёў — | 6.12 | 19.44 | 13.32 |
| Гомель — | 6.11 | 19.38 | 13.27 |
| Гродна — | 6.38 | 20.08 | 13.30 |
| Брэст — | 6.41 | 20.07 | 13.26 |

## Месяц

*Апошняя квадра 5 верасня. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксея, Васіля, Івана, Міхаіла, Фёдара.*
***К.** Ліліяны, Разаліі, Ружы, Майсея.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +20..+22°С | КІЕЎ +22..+24°С | РЫГА +17..+19°С |
| ВІЛЬНЮС +19..+21°С | МАСКВА +16..+18°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Я ж, наіўная, думала, што не нарадзіўся яшчэ той чалавек, які зможа мной камандаваць. Дарма. Аказваецца, я нарадзіла яго сама...**

Вырашыў заняцца бегам. Пару кіламетраў прабег...
Назад прыехаў на таксі.

**Адна жанчына не тое каб хавала ўзрост, але традыцыйна на падобнае пытанне адказвала: трыццаць тры. І вось (сыну гадоў пяць) у мамы быў чарговы дзень нараджэння. І на пытанне сына, колькі ёй гадоў, яна, не задумваючыся, адказвае: трыццаць тры. На наступны год (сыну 6 гадоў), яна адказвае гэтак жа. І гэтак далей. Карацей, калі сыну было гадоў восем, ён западозрыў нядобрае.**

**— Мама, як так? Табе і летась было трыццаць тры, і пазалетась, і, па-мойму, раней таксама?**

**Тая дзівіцца і кажа:**

**— Сынок, я, зразумела, жартую. Мне на самой справе сорак тры.**

**Сын (з жахам):**

**— А тата ведае?**!

Пчаляр здагадаўся, што жонка знайшла заначку, калі ўбачыў яе з апухлым тварам, але ў новай сукенцы.




caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

## 4 ВЕРАСНЯ

**1563** год — у Брэсцкай друкарні на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага выдадзена Біблія, у якой былі змешчаны ўсе тэксты Старога і Новага запавета. Гэтая самая вялікая і багата аформленая беларуская друкаваная кніга XVI стагоддзя. У пераплёце са скуры, з цудоўнымі ілюстрацыямі і нават з прадметным паказальнікам (што было ўпершыню ў беларускім кнігадрукаванні). На кожнай старонцы на палях маюцца каментары да тэксту. Надрукавана гатычным шрыфтам у дзве калонкі па 58 радкоў у кожнай. Асобнікі Радзівілаўскай Біблії захоўваюцца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы ў Маскве, Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Пецярбургу, Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы, у Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве, няпоўны экзэмпляр — у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі.

**1809** год — нарадзіўся Юліуш Славацкі, вядомы польскі паэт і драматург. У 1825-1828 гадах вучыўся ў Віленскім універсітэце. У 1829-м пераехаў у Варшаву. З 1831 года жыў у эміграцыі (Францыя, Швейцарыя, Грэцыя, Італія). Аўтар драм «Мазепа», «Кардыян», «Ліла Венеда» і інш. Памёр у 1849-м. На беларускую мову яго асобныя творы пераклалі А. Вольскі, С. Дзяргай, М. Лужанін, М. Танк. У 1952 годзе па аднайменнай драме дзяржаўны тэатр оперы і балета Беларусі паставіў оперу «Мазепа», у 1959-м Беларускі тэатр імя Я. Купалы — спектакль «Смерць ваяводы».

**1859** год — нарадзіўся (былы фальварак Будзькаўшчына, цяпер Полацкі раён) Бранісла̌ў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла, беларускі выдавец, мовазнавец, кандыдат гісторыка-філалагічных навук (1887), сапраўдны член Інбелкульта (1924). У 1885 годзе скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. З 1891-га працаваў у бібліятэцы ўніверсітэта, адначасова выкладаў у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах Пецярбурга. З 1925 года — рэдактар, у 1927-1929-м — старшыня камісіі Інбелкульта па складанні слоўніка беларускай мовы. Збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору Беларусі. Ініцыятар стварэння, адзін з кіраўнікоў беларускага легальнага выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906-1914), студэнцкага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка (1912-1917), Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны. Укладальнік рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі», у якой сабраны асобныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, У. Сыракомлі, Цёткі і інш. Садзейнічаў творчаму станаўленню Я. Купалы, быў рэдактарам яго першага зборніка «Жалейка», захаваў неапублікаваныя творы пецярбургскага перыяду (захоўваюцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску). Памёр у 1934 годзе.



## Было сказана

**Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:**
*«Як бы там ні было добра, але калі гэтае дабро цэлы век астаецца без усякай змены, то яно лёгка перастае быць дабром».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3387.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12